ISSN 0321-0359

# ВЕСНІК

## Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна

## СЕРЫЯ 3

Гісторыя
Філасофія
Эканоміка
Права

3'90

## ЗМЕСТ

### ГІСТОРЫЯ


*Калеснікава Т. К., Мельнік Ф. І.* Творчая актыўнасць рабочых прамысловасці Беларусі ў 70—80-я гады: вопыт, праблемы . . . . . . . . . . 3

*Раманоўскі І. Ф., Шадурскі В. Г.* Партыйнае кіраўніцтва рухам настаўніцтва: становішча і праблемы (1976—1987) . . . . . . . . . . . . . . . 6

*Лапо І. М.* Перабудова сістэмы маральнага выхавання ў школах Беларусі на сучасным этапе (з вопыту работы КПБ) . . . . . . . . . . . . 9

*Ходзін С. М.* Арганізацыя перапрацоўкі сельскагаспадарчай прадукцыі ў калектыўных гаспадарках БССР (другая палова 20-х гадоў) . . . . . . . 12

*Ильящук Г. И.* К вопросу о существовании так называемого «Союзного Бюро социал-демократов-меньшевиков» . . . . . . . . . . . . . . . 15

*Филиппенко С. И.* Германия и проблема реорганизации Совета Лиги наций 18


### ФІЛАСОФІЯ


*Михайлов А. А.* Завершающий аккорд критической системы И. Канта (к 200-летию выхода в свет работы «Критика способности суждения») . . . 21

*Рожин Н. В.* Проблема референции и объективность знания . . . . . 27

*Потерухина Л. П.* Общение как фактор развития личности . . . . . 32

*Грушка Михал.* Теоретические основания современного католического учения о свободе совести . . . . . . . . . . . . . . . . . . 35

*Поликарпов В. А.* Социокультурные общности молодежи в условиях перестройки . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 38

*Огородник В. П.* Роль художественной интеллигенции в развитии межнационального общения . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 40


### ЭКАНОМІКА


*Ермалович Л. П., Быкова Т. П.* Особенности проведенного К. Марксом научного анализа заработной платы и его методологическое значение . . . . . 44

*Научитель М. В.* Об экономической теории предложения . . . . . . 47

*Бесман В. В.* Рынок как экономическая категория . . . . . . . . . 52


### ПРАВА


*Сатолин В. Н.* Законодательство о браке и семье, действовавшее на территории Белоруссии в первые годы Советской власти . . . . . . . . . . 56

*Зенькович В. А.* К вопросу о совершенствовании законодательства по предотвращению обмана покупателей . . . . . . . . . . . . . . . . 59

*Власова Л. В., Колосовский А. Н.* Юрисдикционный иммунитет государств в отношении их собственности . . . . . . . . . . . . . . . . 62

*Мошканов А. С.* Предмет доказывания по делам об ограничении дееспособности граждан . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 65


### ДЫСКУСІЙНАЯ ТРЫБУНА


*Клімовіч В. С.* Чаму нам патрэбна дэмакратыя . . . . . . . . . . 69

*Алпееў А. М.* Разважанні аб некаторых праблемах перабудовы ў прамысловасці Беларусі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 71


### РЭЦЭНЗІІ


*Савчук Е. Ф., Сидорцов В. Н.* И. Н. Олегина. Критика концепций современной американской и английской буржуазной историографии по проблемам индустриализации СССР . . . . . . . . . . . . . . . . . 75

*Ревяко К. А., Лисовый И. А.* Dějiny pravěku a starověku . . . . . . 76

*Дубинин И. И.* В. А. Героименко. Личностное знание и научное творчество 76

*Салихов М. В.* П. В. Кикель. Математизация научного знания . . . . 77

# ВЕСНІК

## Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна

НАВУКОВА-ТЭАРЭТЫЧНЫ ЧАСОПІС

Выдаецца з сакавіка 1969 года
адзін раз у чатыры месяцы

## СЕРЫЯ 3

## Гісторыя
## Філасофія
## Эканоміка
## Права

# 3'90

ЛІСТАПАД

МІНСК
УНІВЕРСІТЭЦКАЕ

*Галоўны рэдактар* **В. Р. РУДЗЬ**

*Адказны сакратар* **П. М. БАРАНОЎСКІ**

**Рэдакцыйная калегія серыі:**

У. К. КОРШУК *(адказны рэдактар)*,
М. І. БАЗЫЛЕЎ, В. М. ГАДУНОЎ, С. Р. ДРАБЯЗКА,
П. П. ДРОНЬ *(нам. адказнага рэдактара)*, А. М. ЕЛСУКОЎ,
Э. М. ЗАГАРУЛЬСКІ, П. І. ЗЯЛІНСКІ, А. Г. ЗЕЛЯНКОЎ,
Ю. Л. КАЗАКОЎ *(адказны сакратар)*, П. М. КОБРЫНЕЦ,
А. А. МІХАЙЛАЎ *(нам. адказнага рэдактара)*, М. В. НАУЧЫЦЕЛЬ, М. В. РОЖЫН, П. А. ШУПЛЯК

ВЕСТНИК БЕЛОРУССКОГО ГОСУДАРСТВЕННОГО УНИВЕРСИТЕТА
имени В. И. ЛЕНИНА

Серия 3, № 3, 1990

Издательство «Университетское».
220048, Минск, проспект Машерова, 11. Дом книги.
Адрес редакции: 220080, Минск, Университетский городок, тел. 20-65-42.

На русском и белорусском языках

Рэдактар *А. А. Сычоў*
Малодшы рэдактар *Г. М. Добыш*
Мастацкі рэдактар *Р. У. Кондрад*
Тэхнічны рэдактар і карэктар *Г. І. Хмарун*

Здадзена ў набор 10.09.90. Падпісана да друку 14.11.90. Фармат 70×108¹/₁₆. Папера друк. № 1. Друк высокі. Ум. друк. арк. 7,0. Ум. фарб.-адб. 7,44. Ул.-выд. арк. 8,54. Тыраж 770 экз. Заказ 945. Цана 80 к.

Выдавецтва «Універсітэцкае». 220048, Мінск, праспект Машэрава, 11. Дом кнігі.
Адрас рэдакцыі: 220080, Мінск, Універсітэцкі гарадок, тэл. 20-65-42.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі. 220041, Мінск, Ленінскі праспект, 79.

© Веснік БДУ імя У. І. Леніна, 1990

# Гісторыя

Т. К. КАЛЕСНІКАВА, Ф. І. МЕЛЬНІК

## ТВОРЧАЯ АКТЫЎНАСЦЬ РАБОЧЫХ ПРАМЫСЛОВАСЦІ БЕЛАРУСІ Ў 70—80-я ГАДЫ: ВОПЫТ, ПРАБЛЕМЫ

Поспехі інтэнсіфікацыі вытворчасці, павышэння яе эфектыўнасці залежаць ад свядомых добрасумленных адносін рабочых да працы. Першапачатковыя працоўныя навыкі прывівае будучаму рабочаму сям'я, затым школа. Важнае значэнне для развіцця эфектыўнасці працоўнага навучання мела Пастанова ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР «Аб далейшым удасканаленні навучання, выхавання навучэнцаў агульнаадукацыйных школ і падрыхтоўкі іх да працы», прынятая ў снежні 1977 года [1]. У распараджэнне навучэнцаў былі прадастаўлены навучальна-вытворчыя камбінаты, майстэрні, лабараторыі. Працоўнае навучанне ажыццяўлялася на прадпрыемствах, у арганізацыях, вучнёўскіх вытворчых брыгадах, лагерах працы і адпачынку і г. д. У 1981—1982 навучальным годзе 98 % навучэнцаў сярэдніх агульнаадукацыйных школ БССР былі ахоплены паглыбленым працоўным навучаннем [2]. Сапраўднай школай фарміравання добрасумленных адносін да працы падрастаючага пакалення з'яўляецца сістэма прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі. Толькі за 1970/71—1980/81 навучальныя гады колькасць сярэдніх прафесіянальна-тэхнічных вучылішчаў у рэспубліцы ўзрасла на 135, а колькасць навучэнцаў — на 86 тыс.[3] Гэта з'явілася вынікам мэтанакіраванай работы ЦК КПБ, Савета Міністраў рэспублікі, якія ўсебакова абмеркавалі пытанні ўдасканалення сістэмы прафадукацыі і прынялі меры па паляпшэнню якасці падрыхтоўкі рабочых кадраў.

У сучасным грамадстве, калі ідзе інтэнсіўнае развіццё новых і мадэрнізацыя існуючых галін вытворчасці на аснове апошніх дасягненняў навукі і тэхнікі, усё большае значэнне набывае вытворча-тэхнічная кваліфікацыя кадраў. Акрамя таго, армія работнікаў прадпрыемстваў пастаянна папаўняецца вялікай колькасцю моладзі, выпускнікамі школ, якія не маюць навыкаў працоўнай дзейнасці. Вось чаму ў гэты перыяд, як ніколі, трэба дабіцца выканання задачы, пастаўленай У. І. Леніным, «каб кожная фабрыка, кожная электрычная станцыя ператварылася ў ачаг асветы»[4].

Важную ролю ў выкананні ленінскага завяшчання адыграла Пастанова ЦК КПСС «Аб рабоце партыйнай арганізацыі Мінскага трактарнага завода па павышэнню вытворчай і грамадска-палітычнай актыўнасці працоўнага калектыву», прынятая 21 студзеня 1972 года [5]. Раскрыўшы патэнцыяльныя магчымасці працоўных калектываў па развіццю і ўдасканаленню вытворчасці, Цэнтральны Камітэт абавязаў партком завода павысіць узровень ідэйна-выхаваўчай работы на прадпрыемстве, накіраваць яе на фарміраванне ў рабочых і служачых марксісцка-ленінскага светапогляду, на усямернае развіццё іх працоўнай і грамадскай актыўнасці, звярнуўшы пры гэтым асаблівую ўвагу на выхаванне камуністычных адносін да працы.

Рэалізуючы пастанову, грамадскія арганізацыі і адміністрацыя трактарнага завода і многіх іншых прадпрыемстваў рэспублікі наладзілі разгалінаваную сетку вытворчага навучання з улікам, галоўным чынам, двух напрамкаў: навучанне рабочых новым прафесіям і павышэнне кваліфікацыі, тэхнічных ведаў шляхам мэтавага навучання праз вытворча-тэхнічныя курсы, школы камуністычнай працы і перадавога вопыту, навучанне другім

прафесіям. Умацоўвалася навучальна-матэрыяльная база прадпрыемстваў, ствараліся тэхнічныя кабінеты, дзейнічалі класы тэарэтычных ведаў, цэхі вытворчага навучання.

Важнае значэнне ў справе павышэння кваліфікацыі кадраў, развіцця рацыянальных прыёмаў і метадаў працы мела пашырэнне передавога вопыту. У створаных школах передавога вопыту глыбока вывучаўся вопыт і працоўныя навыкі В. Патаповіча, П. Клімкова, В. Прыходчанкі, А. Аляксеевіча і многіх іншых наватараў. Толькі за 70-я гады амаль у 3,5 разы ўзрасла колькасць работнікаў, якія павысілі кваліфікацыю непасрэдна на вытворчасці.

Немалую ролю ў падрыхтоўцы і выхаванні кадраў рабочага класа адыграла настаўніцтва. З пашырэннем і развіццём настаўніцтва ўзнікла пытанне аб паўсядзённым кіраўніцтве гэтым рухам, што прывяло да арганізацыі саветаў настаўнікаў. Да мая 1975 года, гэта значыць праз год пасля іх стварэння, у БССР было звыш 2700 саветаў.

Лепшым настаўнікам прысвойвалася ганаровае званне «Заслужаны настаўнік рабочай моладзі Беларускай ССР». Яны ўзнагароджваліся значкамі ВЦСПС і ЦК ВЛКСМ «Настаўнік моладзі». Да 1981 года званне «Заслужаны настаўнік працуючай моладзі Беларускай ССР» было прысвоена 77 лепшым рабочым і служачым рэспублікі. Толькі ў дзесятай пяцігодцы ў рэспубліцы была створана 131 галерэя настаўнікаў, больш 17 тыс. лепшых выхавацеляў занесены ў кнігі працоўнай славы, на Дошкі гонару. У Палацах і дамах культуры, у чырвоных кутках інтэрнатаў афармляліся стэнды, фотавітрыны, выстаўкі, якія расказвалі аб дзейнасці настаўнікаў, іх жыццёвым шляху.

У той жа час у рабоце настаўнікаў у гэтыя гады накапіліся сур'ёзныя праблемы, якія тармазілі развіццё патрыятычнага руху. Часам работа з маладымі работнікамі вытворчасці пускалася на самацёк. У многіх працоўных калектывах шэфства зводзілася толькі да навучання працоўным прыёмам і прафесіянальным навыкам і ў той жа час недастатковая ўвага ўдзялялася фарміраванню ў юнакоў і дзяўчат актыўнай жыццёвай пазіцыі, высокіх маральных якасцей. Многія саветы настаўнікаў існавалі толькі на паперы, а іх работу падмянялі парткомы.

На сённяшнім этапе перабудовы канкрэтнымі праяўленнямі і паказчыкамі працоўнай актыўнасці рабочага класа з'яўляюцца ўдзел у сацыялістычным спаборніцтве, працоўныя ініцыятывы, выкарыстанне перадавых пачынаў, выкананне і перавыкананне вытворчых заданняў, высокая якасць прадукцыі, удзел у тэхнічнай творчасці, павышэнне кваліфікацыі, авалоданне сумежнымі прафесіямі, умацаванне працоўнай дысцыпліны.

Вышэйшай формай сацыялістычнага спаборніцтва з'яўляюцца камуністычныя адносіны да працы, у якой арганічна спалучаюцца барацьба за высокую прадукцыйнасць працы, павышэнне эфектыўнасці вытворчасці, імкненне да ведаў, новыя адносіны паміж людзьмі, заснаваныя на ўзаемадапамозе, узаемавыручцы, узаемападтрымцы.

Кампартыяй Беларусі праведзена значная арганізатарская і палітыкавыхаваўчая работа па глыбокаму ўсведамленню мэт і задач спаборніцтва. Трывалае месца ў шэрагу асноўных звенняў ідэйна-выхаваўчай работы працоўных калектываў занялі школы камуністычнай працы. Многае было зроблена па ўдасканаленню іх работы.

Толькі за гады дзесятай пяцігодкі амаль на 40 % павялічылася сетка школ у рэспубліцы, значна ўзрасла колькасць слухачоў у іх. У 1980 годзе ў БССР функцыяніравала больш чым 16 тыс. школ, у якіх займалася каля 390 тыс. чалавек. Больш арганізаваным стаў у іх навучальны працэс, узрасла выніковасць вучобы [6].

У арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва партыйныя арганізацыі шырока прымянялі галоснасць. Яна давала магчымасць мабілізаваць намаганні калектываў на развіццё масавага працоўнага спаборніцтва, выдзяляць лепшыя ўзоры для пераймання, абуджала да паўтарэння вопыту, пошуку новых магчымасцей для павышэння эфектыўнасці прамысловай вытворчасці.

Сацыялістычнае спаборніцтва стала вядучай тэмай шматтыражнай прэсы. Рэгулярна пад рубрыкамі «Людзі новага часу», «Ударнікі пяцігодкі», «Працоўная вахта», «Дзённік спаборніцтва» газеты расказвалі аб здзяйсненнях працаўнікоў прадпрыемстваў, ускрывалі ўпушчэнні і недахопы, падводзілі вынікі працоўнай дзейнасці.

Аршанскім гаркомам партыі пачала практыкавацца такая форма нагляднай агітацыі, як устаноўка сюжэтных стэндаў, у якіх расказвалася аб

гісторыі і працоўных справах прадпрыемстваў, з фатаграфіямі ветэранаў працы, пераможцаў сацыялістычнага спаборніцтва.

Партыйныя арганізацыі актыўна падтрымлівалі новыя формы спаборніцтва, садзейнічалі максімальна шырокаму іх распаўсюджванню.

Важны рэзерв эканамічнага росту партыя бачыць у строгім захаванні рэжыму эканоміі, беражлівасці і дбайным выкарыстанні працоўных і матэрыяльных рэсурсаў. Сучасная вытворчасць характарызуецца лічбамі сапраўды астранамічнага маштабу: кожны працэнт сэканомленай сыравіны і матэрыялаў у народнай гаспадарцы краіны складае цяпер 6,4 млрд. рублёў [7].

У рэспубліцы працавалі тысячы саветаў садзейнічання ахове сацыялістычнай уласнасці, дзесяткі тысяч пастоў і груп садзейнічання народнаму кантролю. Яны дапамагалі фарміраваць ва ўсіх членаў працоўных калектываў адказнасць за грамадскае багацце, змагаліся з марнатраўствам і безгаспадарчасцю.

Калектыў Наваполацкага аб'яднання «Палімір» з'явіўся ініцыятарам укаранення комплекснага метаду абслугоўвання няспынных тэхналагічных працэсаў, накіраванага на забеспячэнне росту прадукцыі пры скарачэнні колькасці працуючых. Прымяненне новых метадаў арганізацыі працы дало магчымасць вызваліць 1550 работнікаў і сэканоміць больш 9 млн. рублёў фонду заработнай платы. Амаль удвая ўзрасла прадукцыйнасць працы. Гэта забяспечыла выкананне заданняў дзевятай пяцігодкі па росту прадукцыйнасці працы за тры, а дзесятай — за чатыры гады [8].

У разглядаемы перыяд значна павысілася выхаваўчая роля сацыялістычнага спаборніцтва і перш за ўсё руху за камуністычныя адносіны да працы, а таксама такіх грамадскіх форм, як рабочыя сходы, вытворчыя нарады, калектыўныя дагаворы, таварыскія суды, грамадскія аддзелы кадраў, саветы ветэранаў працы.

Важным паказчыкам творчых адносін да працы з'яўляецца няспынны пошук новага, рацыянальнага. Гэта асабліва ярка праявілася ў імкненні мадэрнізаваць тэхніку, механізаваць вытворчыя працэсы, скараціць непрадукцыйную ручную працу. Менавіта гэтаму напрамку ўдасканалення вытворчасці партыя сёння адводзіць выключна важную ролю.

Пытанні, звязаныя з рэканструкцыяй прадпрыемстваў, уважліва разглядаліся ў ЦК КПБ і на пасяджэннях абласных, гарадскіх і раённых камітэтаў партыі, пярвічных партыйных арганізацый прадпрыемстваў. У выніку тэхнічная творчасць у 70—80-я гады прыняла масавы характар.

Па вартасці ацэньваючы дасягнутае, нельга не бачыць і таго, што ў творчай рабоце наватараў тэхнікі ў даследуемы перыяд прыкметна нараслі негатыўныя моманты, знізілася прэстыжнасць рацыяналізатарскай справы сярод многіх рабочых. Многія каштоўныя распрацоўкі доўгі час не знаходзілі прымянення. Штогод па рэспубліцы не ўкаранялася звыш 25 тыс. рацыяналізатарскіх прапаноў, гэта значыць кожная пятая, а на прадпрыемствах прыборабудавання, аўтамабільнай прамысловасці — кожная трэцяя; будаўнічага, дарожнага і камунальнага машынабудавання — кожная другая [9].

Для паляпшэння работы партыйных і грамадскіх арганізацый па выхаванню ў рабочых добрасумленных, свядомых адносін да працы, разумення яе грамадскай значнасці неабходна зрабіць кожнага рабочага гаспадаром свайго прадпрыемства, забяспечыць галоснасць працоўнага саперніцтва, заахвочванне пераможцаў. Жыццё рашуча патрабуе шукаць новыя формы, шляхі і сродкі вырашэння выхаваўчых задач.

[1] Гл.: КПСС в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК. М., 1978. Т. 12. С. 584 и далее.
[2] Гл.: Народное хозяйство Белорусской ССР в 1981 г.: Статистический сборник. Минск, 1982. С. 201.
[3] Там жа. С. 202.
[4] Ленін У. І. Творы. Т. 31. С. 482.
[5] Гл.: КПСС в резолюциях... 1977. Т. 11. С. 34 и далее.
[6] ПА ІГП пры ЦК КПБ. Ф. 4, воп. 134, спр. 2, арк. 33.
[7] Гл.: Правда. 1982. 23 ноября.
[8] ПА ІГП пры ЦК КПБ. Ф. 4, воп. 134, спр. 2, арк. 80.
[9] Гл.: Звязда. 1987. 24 студзеня; Советская Белоруссия. 1988. 13 марта.

І. Ф. РАМАНОЎСКІ, В. Г. ШАДУРСКІ

# ПАРТЫЙНАЕ КІРАЎНІЦТВА РУХАМ НАСТАЎНІЦТВА: СТАНОВІШЧА І ПРАБЛЕМЫ (1976—1987)

Сёння перад усім савецкім грамадствам і КПСС стаіць складаная задача — вывесці эканоміку краіны з крызіснага стану. Для яе рашэння неабходна пазбавіцца ад аджыўшага гаспадарча-эканамічнага механізму з уласцівымі яму жорсткай цэнтралізацыяй, ураўнілаўкай. Трэба стварыць новы механізм, які б матэрыяльна стымуляваў творчую ініцыятыву, прадпрымальнасць, інтэнсіўную і якасную работу.

Важнай крыніцай руху наперад з'яўляецца павышэнне ўзроўню прафесійнай падрыхтоўкі маладых рабочых, упершыню прыйшоўшых на вытворчасць, паскарэнне адаптацыі юнакоў і дзяўчат у працоўным калектыве, выхаванне дастойнай рабочай змены. У вырашэнні гэтых праблем многае могуць зрабіць рабочыя педагогі.

Практычную цікавасць мае вывучэнне вопыту работы партыйных арганізацый Беларусі па развіццю руху настаўніцтва, праграма якога была акрэслена пастановай ЦК КПБ «Аб далейшым развіцці і ўдасканаленні руху настаўніцтва ў рэспубліцы» (12 чэрвеня 1974 года). У мэтах паляпшэння кіраўніцтва настаўніцтвам было прапанавана стварыць на прадпрыемствах, у арганізацыях грамадскія саветы настаўнікаў моладзі, партыйным, прафсаюзным і камсамольскім арганізацыям — палепшыць падбор, арганізаваць сістэматычную вучобу настаўнікаў працуючай моладзі [1].

Партыйныя і камсамольскія арганізацыі, гаспадарчыя кіраўнікі імкнуліся забяспечыць індывідуальны падыход пры выбары настаўнікаў, своечасова заўважаць у рабочых, спецыялістаў педагагічныя здольнасці, актыўна накіроўваць іх на карысць справе, заахвочваць імкненне перадавікоў да шэфскай работы.

Менавіта так пастаўлена справа на Гродзенскім вытворчым аб'яднанні «Азот» імя С. О. Прытыцкага. Тут з першага дня навічкі акружаны ўвагай, адчуваюць, што яны патрэбны калектыву. На савеце настаўнікаў разглядаюцца пытанні навучання маладых рабочых, павышэння іх культурнага і прафесійнага ўзроўню, шмат увагі ўдзяляецца навучанню саміх настаўнікаў, арганізавана іх вучоба ў народным універсітэце тэхніка-эканамічных ведаў. Завадская шматтыражка «Гродзенскі хімік» рэгулярна прапагандуе вопыт лепшых настаўнікаў. Сапраўдны партыйны клопат аб выхаванні рабочай змены, аб развіцці руху настаўніцтва прыносіць немалы эканамічны эфект, садзейнічае росту прадукцыйнасці працы, уменню працаваць ініцыятыўна, творча.

З поўнай адказнасцю ставяцца да шэфства над моладдзю і ў іншых калектывах. Шмат цікавага, напрыклад, рабілася і робіцца па развіццю настаўніцтва ў Мінскім вытворчым аб'яднанні «Гарызонт». Тут падрыхтоўка рабочых педагогаў разглядаецца як адзін з важнейшых участкаў палітыка-выхаваўчай работы. Дзейнічаюць цэхавыя саветы настаўнікаў. Члены саветаў наведваюць маладзёжныя інтэрнаты і сем'і маладых работнікаў вытворчасці, дапамагаюць у рашэнні бытавых пытанняў, клапоцяцца аб стварэнні спрыяльных умоў для навучання, уносяць прапановы ў прафсаюзны і камсамольскі камітэты па пытаннях выхавання моладзі. У гэтых умовах юнакі і дзяўчаты хутка становяцца самастойнымі, паўнапраўнымі членамі калектываў, майстрамі сваёй справы. Толькі ў 1980 годзе тут павысілі разрад 1700, асвоілі другую прафесію і сумежныя аперацыі 800 маладых рабочых [2].

У гады X і XI пяцігодак, як сведчыць статыстыка, значна павялічылася колькасць рабочых педагогаў. У 1976 годзе ў працоўных калектывах Беларусі працавала больш за 43 тыс. настаўнікаў, у іх ліку 20 тыс. членаў КПСС, 21 Герой Савецкага Саюза, 151 Герой Сацыялістычнай Працы. Яны шэфствавалі над 80 тыс. маладых рабочых. У 1985 годзе настаўнікамі моладзі з'яўляліся 163 тыс. чалавек, у тым ліку 206 Герояў Сацыялістычнай Працы, 15 Герояў Савецкага Саюза. Яны шэфствавалі над 165 тыс. юнакоў і дзяўчат. 79 лепшых працаўнікоў былі ўдастоены звання «Заслужаны настаўнік моладзі»[3]. Тысячы майстроў сваёй справы па добрай волі перадаюць юнакам і дзяўчатам навыкі сваёй спецыяльнасці, выхоўваюць пачуццё адказнасці за справу, гонару за рабочую прафесію. Славу і павагу заваявалі ў калектывах такія настаўнікі, як С. І. Аўсіевіч, Герой Сацыялістычнай Працы, наладчык ГПЗ-11; В. П. Булава, прадзільшчыца Баранавіцкага баваўнянага камбіната імя Ленінскага камсамола Беларусі; І. Я. Парфёненка, Герой Сацыялістычнай Працы, выпрабавальнік рухавікоў Мінскага ма-

торнага завода; В. К. Зялёнка, брыгадзір лакаматыўнага дэпо станцыі Жлобін, тысячы іншых слаўных працаўнікоў, побач з якімі расце дастойная змена. Яны ўносяць свой вялікі і бескарыслівы ўклад у працоўнае, палітычнае і маральнае выхаванне моладзі. Паказальны ў гэтых адносінах добры прыклад швяі Віцебскай фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі», Героя Сацыялістычнай Працы М. В. Анібраевай, якая навучыла майстэрству больш за 50 работніц, 40 з іх сталі настаўнікамі [4]. Такія працоўныя традыцыі: майстар выхоўвае майстра. Сутнасць настаўніцтва добра выказаў Герой Сацыялістычнай Працы, шліфоўшчык Мінскага завода аўтаматычных ліній К. П. Саленік: «Наш клопат аб моладзі — гэта не дабрачыннасць і не апека. Ён нарадзіўся з нашай уласнай патрэбнасці быць упэўненымі, што нашы сыны і дочкі не адстануць ад нас, а пойдуць далей. Дзеля гэтага і працуем мы, настаўнікі моладзі. Я бачу ў гэтым сэнс жыцця»[5].

На Мінскім трактарным заводзе над маладымі работнікамі вытворчасці шэфствуюць больш як 840 настаўнікаў. Сярод іх шмат камуністаў, кожны чацвёрты ўдастоены ўрадавых узнагарод, каля 80 % з'яўляюцца кадравымі рабочымі.

Партыйныя арганізацыі, працоўныя калектывы, настаўнікі завода далучаюць моладзь да ўдзелу ў абмеркаванні планаў сацыяльнага развіцця калектыву, імкнуцца, каб кожны навічок атрымаў падтрымку кадравых рабочых. І гэта работа дае нядрэнны плён: з ліку выхаванцаў рабочых педагогаў не выконваюць нормы выпрацоўкі 9,3 %, а з тых, хто іх не мае — каля 20 %. З дапамогай настаўнікаў толькі ў 1988 годзе больш 1,5 тыс. юнакоў і дзяўчат асвоілі рабочыя спецыяльнасці, звыш 650 чалавек вучацца ў школах рабочай моладзі і на курсах павышэння кваліфікацыі. Завадскія выхаваўцы дапамаглі 1700 маладым працаўнікам набыць сумежныя прафесіі, укараніць 340 рацыяналізатарскіх прапаноў з эканамічным эфектам 330 тыс. рублёў [6].

Але ў многіх выпадках адміністрацыя і грамадскія арганізацыі не спяшаліся адгукнуцца на запыты навічкоў, якія прыйшлі ў заводскія цэхі. Часта да падбору настаўнікаў падыходзілі фармальна. Былі выпадкі, калі да выхавання моладзі далучаліся людзі абыякавыя, а часам і недастойныя гэтага па сваіх маральных і дзелавых якасцях. Так, на Барысаўскім шклозаводзе імя Дзяржынскага доўгі час у ролі настаўнікаў лічыліся рабочыя Дзямідчык, Сіліч, Бацізаў, якія самі парушалі працоўную дысцыпліну. Натуральна, яны не цікавіліся ўмовамі працы і быту падапечных [7]. І не дзіўна, што ў такіх «настаўнікаў» вучні часта расчароўваліся ў выбранай прафесіі, адчувалі сябе няўтульна, не прыжываліся ў калектыве.

У якасці аднаго з рэзерваў паляпшэння работы настаўнікаў партыйныя камітэты рэспублікі разглядалі іх навучанне. У сістэму падрыхтоўкі настаўнікаў моладзі ўваходзілі факультэты настаўнікаў пры народных універсітэтах маральнай адукацыі, семінары, навукова-практычныя канферэнцыі, лекторыі. Першы універсітэт настаўнікаў быў створаны ў 1976 годзе на Мінскім аўтамабільным заводзе, а ў 1982 годзе іх у рэспубліцы налічвалася ўжо больш як 300.

Заслугоўвае ўвагі работа Гродзенскага народнага універсітэта настаўнікаў, які пачаў работу ў 1976 годзе на базе Палаца культуры тэкстыльшчыкаў. У ім займалася каля 100 старшынь і членаў саветаў настаўнікаў моладзі прадпрыемстваў горада. Кіраўніцтва універсітэтам ажыццяўляў савет. Праграма была разлічана на два гады. Да кожных заняткаў спецыяльна падбіраліся хранікальна-дакументальныя і навукова-папулярныя фільмы. Вопыт работы гарадскога універсітэта настаўнікаў перыядычна асвятляўся на старонках абласной газеты «Гродзенская праўда», у перадачах абласнога радыё. Навучальны год заканчваўся навукова-практычнай канферэнцыяй.

У гарадах і раёнах, на буйных прадпрыемствах у даследуемы перыяд былі створаны школы настаўнікаў. У 1976 годзе ў рэспубліцы працавала каля 459, а ў 1981 — ужо 695 такіх школ. У іх займалася 38,7 тыс. рабочых педагогаў [8].

Аднак у арганізацыі навучання рабочых педагогаў назіраліся сур'ёзныя ўпушчэнні. Так, у 1985 годзе толькі 22 % настаўнікаў было ахоплена рознымі формамі павышэння кваліфікацыі, у прапануемых курсах слаба ўлічваліся асаблівасці прадпрыемстваў. Апытанне, праведзенае на шэрагу прадпрыемстваў Беларусі, паказала, што 85,4 % настаўнікаў мае патрэбу ў павышэнні тэарэтычных ведаў, больш за 40 % жадалі павысіць тэарэтычныя веды, 87,9 % не мелі ўяўлення аб вопыце работы настаўнікаў на іншых прадпрыемствах [9].

Сістэма навучання настаўнікаў патрабуе карэнных змен. На наш погляд,

трэба адмовіцца ад агульнага выкладання тэарэтычных асноў педагогікі, а наблізіць змест навучання да спецыфікі вытворчасці, да вывучэння вопыту лепшых настаўнікаў, псіхолага-педагагічных асноў працэсу выхавання.

Развіццю руху настаўніцтва, распаўсюджванню вопыту работы лепшых садзейнічалі раённыя, гарадскія, абласныя злёты настаўнікаў. Так, у маі 1975 года адбыўся першы беларускі злёт настаўнікаў моладзі. На другім (ліпень 1981) быў выбраны рэспубліканскі савет настаўнікаў, закліканы накіроўваць і каардынаваць работу абласных, гарадскіх і раённых саветаў. Удзельнікі злёту звярнуліся з заклікам да ўсіх кадравых рабочых, калгаснікаў і інжынерна-тэхнічных работнікаў, майстроў вытворчасці, спецыялістаў народнай гаспадаркі: «Наша задача — актыўна садзейнічаць таму, каб для кожнага маладога чалавека працоўны калектыў стаў другой сям'ёй, каб ні адзін навічок вытворчасці не заставаўся без па-бацькоўску чулага і строгага настаўніка»[10].

У даследуемы перыяд у рабоце настаўнікаў накапіліся сур'ёзныя праблемы, якія тармазілі развіццё гэтага руху. У многіх працоўных калектывах шэфства над моладдзю зводзілася толькі да навучання працоўным прыёмам і прафесійным навыкам, недастаткова ўвагі ўдзялялася фарміраванню у юнакоў і дзяўчат высокіх маральных якасцей. Так, на пленуме Гродзенскага АК КПБ (чэрвень 1980 года) крытыкаваліся за фармалізм у арганізацыі настаўніцтва партыйныя і гаспадарчыя кіраўнікі Гродзенскага малочнага завода, тонкасуконнага камбіната, Гальшанскага крухмальнага завода і іншых прадпрыемстваў[11].

Не сталі дзейснымі органамі, якія б ажыццяўлялі кіраўніцтва рухам рабочых выхавацеляў, саветы настаўнікаў. Многія з іх існавалі толькі на паперы, а іх работу падмянялі партыйныя камітэты. Шмат фармалізму было і ў ацэнцы вынікаў работы настаўнікаў. На большасці прадпрыемстваў яна абмяжоўвалася такім паказчыкам, як колькасць падрыхтаваных вучняў. Пагоня ж за колькасцю немінуча зніжала якасць падрыхтоўкі маладых рабочых.

Існуючыя недахопы прызнаваліся на пленумах і пасяджэннях бюро партыйных камітэтаў, на сходах пярвічных партыйных арганізацый. Аднак далей крытыкі справа не ішла. Рух настаўніцтва не ператварыўся ў самарэгулюючую сістэму, яна знаходзілася ў залежнасці ад асабістых якасцей настаўніка, ад пастаяннага сілавога націску з боку партыйных камітэтаў і адміністрацыі. Настаўніцтва не мела трывалай эканамічнай і прававой базы. Не былі вызначаны і тэрміны шэфства, правы і абавязкі вучняў і іх настаўнікаў. Гэтыя праблемы не вырашаліся і не маглі быць вырашанымі ва ўмовах аджыўшага гаспадарча-эканамічнага механізму.

На наш погляд, сёння неабходна падмацаваць настаўніцтва матэрыяльнымі стымуламі, паставіць яго ў залежнасць ад якасці і колькасці падрыхтаваных вучняў. Мэтазгодна, відаць, рэкамендаваць прадпрыемствам з улікам спецыфікі вытворчасці дакладна вызначыць правы і абавязкі шэфаў і іх падшэфных, пачатак і канец вучнёўства, крытэрыі ўзроўню падрыхтоўкі.

Шырокія магчымасці для фарміравання высокіх прафесійных навыкаў у моладзі адкрылі самафінансаванне прадпрыемстваў і ўнутрызаводскі гасразлік. У падраздзяленнях, дзе клопат аб становішчы спраў на вытворчасці ўзялі пад сваю адказнасць самі рабочыя, у ролі настаўніка выступае ўвесь калектыў. І гэта натуральна. Бо калектыву эканамічна выгадна, каб кожны працаваў добра, дасканала авалодаў спецыяльнасцю, ведаў і сумежныя прафесіі. Вядома, чым хутчэй замацуецца на рабочым месцы малады працаўнік, чым эфектыўней, якасней і больш эканамічна ён будзе працаваць, тым больш зладжанымі стануць дзеянні ўсёй брыгады, усяго участка, вышэй прадукцыйнасць працы.

На сучасным этапе развіцця грамадства ўзаемадзеянне настаўнікаў і моладзі мае асабліва важнае значэнне. Перабудова патрабуе ўзняць на якасна новы ўзровень выхаванне працоўнай змены. Немалаважная роля ў гэтым належыць настаўнікам, чыё прызванне — вучыць моладзь рабочаму майстэрству, прывіваць ёй высокія грамадзянскія якасці, дапамагаць заняць актыўную пазіцыю ў перабудове.

[1] ПА ІГП пры ЦК КПБ. Ф. 4, воп. 81, спр. 2545, арк. 12.
[2] Гл.: Советская Белоруссия. 1981. 5 июня.
[3] Гл.: Коммунист Белоруссии. 1976. № 6. С. 13; Цярэшка М. Н. Барацьба з праявамі чужой маралі. Мінск, 1986. С. 34.
[4] ПА Віцебскага АК КПБ. Ф. 119, воп. 48, спр. 1, арк. 39.

[5] Бягучы архіў Белсаўпрофа: Даведка аб развіцці руху настаўніцтва ў Беларускай ССР ад 17 верасня 1986 г.

[6] Гл.: Шыбаліс А. М. Навічок у рабочым калектыве. Мінск, 1988. С. 37, 38.

[7] ПА Мінскага АК КПБ. Ф. 1, воп. 74, спр. 13, арк. 34.

[8] Гл.: Агульны архіў Белсаўпрофа. Ф. 1, воп. 11, спр. 2132, арк. 14—15; Спр. 1704, л. 28; Бягучы архіў Белсаўпрофа: Даведкі і іншыя дакументы па развіццю настаўніцтва за 1982 г.

[9] Гл.: Бягучы архіў Белсаўпрофа: Даведка аб развіцці руху настаўніцтва ў БССР ад 10 верасня 1985 г.; Шыбаліс А. М. Навічок у рабочым калектыве. С. 41.

[10] Советская Белоруссия. 1981. 5 июля.

[11] ПА Гродзенскага АК КПБ. Ф. 1, воп. 84, спр. 9, арк. 14.

І. М. ЛАПО

## ПЕРАБУДОВА СІСТЭМЫ МАРАЛЬНАГА ВЫХАВАННЯ Ў ШКОЛАХ БЕЛАРУСІ НА СУЧАСНЫМ ЭТАПЕ

### (з вопыту работы КПБ)

Перабудова сістэмы народнай адукацыі вылучыла на першы план задачу глыбокага пераасэнсавання тэорыі і практыкі духоўна-маральнага станаўлення школьнікаў. Ленінскае патрабаванне «каб уся справа выхавання, адукацыі і вучэння сучаснай моладзі была выхаваннем у ёй камуністычнай маралі»[1] у нашы дні набывае асобы сэнс і значэнне. Пытанні фарміравання маральных асноў падрастаючага пакалення знаходзіліся ў цэнтры ўвагі XXVII з'езда КПСС, XIX Усесаюзнай партыйнай канферэнцыі і пленумаў ЦК КПСС. Шэраг прынцыповых рэкамендацый па ўдасканаленню палітычнага кіраўніцтва маральна-выхаваўчай работай у школе даў, напрыклад, лютаўскі (1988) Пленум ЦК КПСС. Адзначаючы, што ажыццяўленне рэформы пакуль не зрушыла ўперад школу на галоўных шляхах перабудовы,— абнаўлення зместу адукацыі і выхавання, дэмакратызацыі навучальна-выхаваўчага працэсу — пленум указаў на неабходнасць рашучага пераадолення эвалюцыйнага характару рэформы, выйшаўшага ў супярэчнасць з рэвалюцыйнай сутнасцю пачатага партыяй пераўтварэння грамадства.

Задачы партыйных арганізацый Беларусі па ўдасканаленню маральна-выхаваўчага працэсу ў школе вызначыў X Пленум ЦК КПБ, які адбыўся ў маі 1988 года. Першачарговую ўвагу пленум удзяліў усебаковаму развіццю творчага патэнцыялу педагагічных калектываў, здольных забяспечыць высокі маральны і агульнаадукацыйны ўзровень як вучэбнай, так і пазакласнай работы.

Кіруючыся гэтымі рашэннямі, многія партыйныя камітэты і арганізацыі рэспублікі паступова выкаранялі заганную практыку дробязнай апекі педагагічных калектываў і рэалізавалі новыя падыходы ў палітычным кіраўніцтве фарміраваннем асобы школьніка. Так, бюро Слонімскага гаркома КПБ у апошні час неаднаразова разглядала розныя аспекты гэтага важнага ўчастка ідэалагічнай работы. Аб'ядноўваючы намаганні партыйных, савецкіх, прафсаюзных, камсамольскіх арганізацый, базавых прадпрыемстваў і грамадскасці, гарком здолеў стварыць у горадзе і на вёсцы ўмовы для навучання, фізічнага, эстэтычнага развіцця і працоўнага выхавання школьнікаў. Перабудова сістэмы народнай адукацыі высвяціла шмат праблем, патрабавала ад партарганізацый школ новых падыходаў да маральна-выхаваўчай сферы, адным з якіх аказалася перспектыўнае планаванне блокамі, што дазволіла намячаць прыярытэтныя напрамкі выхаваўчай работы. У далейшым з гэтых вузлавых праблем вылучаліся канкрэтныя пытанні, вырашэнне якіх дазваляла рэальна ацэньваць дзейнасць партыйнай арганізацыі, кожнага камуніста. У выніку значна пашырыўся ўдзел партыйных арганізацый у аптымізацыі навучальна-выхаваўчага працэсу, у падрыхтоўцы моладзі да жыцця і працы. Па прапанове камуністаў у раёне створаны творчыя групы настаўнікаў, якія прапагандуюць педагагічнае майстэрства і аказваюць метадычную дапамогу калегам. Праводзіцца сістэматычная дыягностыка вопыту настаўнікаў і педагагічных калектываў у мэтах удасканалення форм і метадаў выхаваўчай работы. Складаюцца дыягнастычныя карты, якія адлюстроўваюць рэальны стан усіх звёнаў выхаваўчага працэсу. Адмаўленне ад устарэлых і малаэфектыўных форм дазволіла партыйным арганізацыям Слонімшчыны ўзмацніць уздзеянне на перабудову школы, забяспечыць комплексны падыход да выхавання і навучання. Так, у 1986 го-

дзе ад 80 да 90 % школьнікаў пацвердзілі абавязковы ўзровень падрыхтоўкі па ўсіх прадметах.

Важным напрамкам у рабоце партыйных арганізацый і калектываў школ Слоніма стала адраджэнне ў педагагічнай практыцы камунарскай методыкі А. С. Макаранкі. Створаны своеасаблівыя цэнтры выхавання, якія дазволілі палепшыць арганізацыю вольнага часу падлеткаў. Папулярнасцю сярод старшакласнікаў і іх бацькоў карыстаюцца, напрыклад, выязныя пасяджэнні палітычнага клуба «Планета» сярэдняй школы № 5. У клубе аматараў мастацтва «Калейдаскоп» сярэдняй школы № 6 больш за 200 чалавек, яны аб'яднаны ў танцавальныя ансамблі «Ноткі», «Усмешка», фальклорныя і вакальна-інструментальныя ансамблі «Беларускія ўзоры» і «Спектр», секцыю «Пазіцыя», вакальную групу, тэатр масак. Настаўнік беларускай мовы і літаратуры сярэдняй школы № 2 А. В. Руцкая, заслужаны настаўнік БССР, член Саюза пісьменнікаў СССР, шмат увагі ўдзяляе развіццю паэтычных здольнасцей вучняў, прывівае ім любоў да нацыянальнай культуры [2].

Вопыт работы Слонімскага гаркома Кампартыі Беларусі па зацвярджэнню новых падыходаў да партыйнага кіраўніцтва адукацыяй і выхаваннем школьнікаў атрымаў высокую ацэнку на лютаўскім Пленуме ЦК КПСС і быў рэкамендаваны іншым гаркомам і райкомам партыі.

Творчы пошук новых форм выхаваўчай работы вылучае таксама партыйныя арганізацыі і калектывы сярэдніх школ № 9 Брэста, № 61, 159 г. Мінска, № 9 г. Мазыра, Валасоўскай і Каханоўскай школ Талачынскага раёна, Ровенска-Слабодскай сярэдняй школы Рэчыцкага раёна і інш.

Важнай умовай перабудовы маральна-выхаваўчага працэсу з'яўляецца дэмакратызацыя ўсіх бакоў школьнага жыцця. Пэўны вопыт у гэтым напрамку назапашаны калектывамі сярэдніх школ №№ 61, 26, 42 Мінска. У гэтых школах вышэйшай формай кіравання стала канферэнцыя, паўнапраўнымі ўдзельнікамі якой з'яўляюцца педагогі, бацькі, вучні. Бягучыя пытанні вырашаюцца на сумесным пасяджэнні савета працоўнага калектыву, вучнёўскага і бацькоўскага камітэтаў. Тут вызначаны крытэрыі ацэнкі работы настаўніка: удасканаленне навучальна-выхаваўчага працэсу, удзел у кіраванні школай, дапамога калегам. У выніку ўзрасла адказнасць настаўнікаў за якасць сваёй работы, бацькоў — за выхаванне дзяцей у сям'і, грамадскасці — за стварэнне ўмоў для развіцця інтарэсаў і схільнасцей дзяцей і падлеткаў. Павысіўся ўзровень ведаў, уменняў і навыкаў вучняў, іх грамадская актыўнасць, зменшылася колькасць правапарушэнняў, зробленых школьнікамі.

Мэтанакіраваная работа па развіццю педагогікі супрацоўніцтва, павышэнне аўтарытэту органаў вучнёўскага самакіравання, камсамольскіх і піянерскіх арганізацый праводзіцца калектывамі сярэдніх школ № 2 г. Наваполацка, № 6 Баранавіч, № 20 Гродна і інш.

Важнае месца ў перабудове сістэмы маральнага выхавання партыйныя арганізацыі школ адводзяць прыцягненню вучняў у грамадска карысную, прадукцыйную працу. Заслугоўвае ўвагі, напрыклад, вопыт партыйнай арганізацыі Коханаўскай сярэдняй школы Талачынскага раёна, дзе з дапамогай базавых прадпрыемстваў (вытворчае аб'яднанне «Будіндустрыя», калгас імя К. Заслонава і інш.) створана вучэбна-матэрыяльная база, якая дазваляе паспяхова вырашаць вучэбныя і выхаваўчыя задачы. Фарміраванню паважлівых адносін да працы дапамагае імкненне педагогаў больш поўна ўлічваць інтарэсы вучняў, уменне ўвязваць тэарэтычныя веды з жыццём. Своеасаблівым працягам урокаў біялогіі сталі тут палявыя даследаванні эфектыўнасці выкарыстання мінеральных угнаенняў, што праводзяцца ў садружнасці з вучонымі Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі. У цеснай сувязі з біёлагамі працуюць настаўнікі хіміі і геаграфіі. На ўроках матэматыкі школьнікаў вучаць вылічваць ураджайнасць культур, рэнтабельнасць вытворчасці, сабекошт прадукцыі. У школьных майстэрнях юныя вынаходнікі пад кіраўніцтвам настаўніка В. Клімовіча сабралі камбінаваны токарны станок, адзначаны бронзавым медалём ВДНГ СССР.

Партыйныя арганізацыі базавых прадпрыемстваў, не абмяжоўваючыся матэрыяльнай дапамогай школе, вылучаюць на першы план выхаваўчую значнасць працы. На першым пасяджэнні савета школы была прынята прапанова партбюро і дырэкцыі аб'яднання даручыць школьнікам выкананне часткі заказа на пастаўку дэталей дрэваапрацоўкі ў Фінляндыю і ФРГ. З'явілася рэальная магчымасць ажыццявіць даўнюю мару школьнага калектыву — самім зарабляць грошы на развіццё школы. Акрамя гэтага, вучні працуюць у двух кааператывах. Толькі ў 1988 годзе на рахунак школы ад іх паступіла больш за 15 тыс. рублёў. Сярод спецыялістаў сельскай гас-

падаркі заслужаным аўтарытэтам карыстаецца аграном калгаса В. А. Красоўскі і трактарыст, лаурэат Дзяржаўнай прэміі СССР В. С. Багамол. В. А. Красоўскі — выпускнік Коханаўскай школы, быў брыгадзірам вучнёўскай вытворчай брыгады. Ён з вялікім клопатам і ўвагай адносіцца да выхавання і навучання будучых хлебаробаў. Значнае маральна-выхаваўчае ўздзеянне на вучняў аказвае іх праца ў вытворчай брыгадзе на арэндным падрадзе. Гаспадарка перадала вучнёўскай брыгадзе зямлю, тэхніку, угнаенні і насенне, спецыялістамі аказана дапамога ў разліку нарматываў аплаты і размеркаванні чыстага даходу.

Сяброўства школы і базавых прадпрыемстваў матэрыялізуецца ў ажыццяўленні праграмы добраўпарадкавання пасёлка, якая распрацавана школьнай партыйнай арганізацыяй. Звыш 900 вучняў, іх бацькоў і многія працоўныя калектывы прынялі ўдзел у будаўніцтве спартыўных пляцовак, дзіцячых гарадкоў і ў азеляненні пасёлка Коханава [3].

Вопыт работы пярвічных партыйных арганізацый і райкома КПБ Талачынскага раёна па ўдасканаленню сістэмы працоўнага навучання і выхавання школьнікаў вывучаны Віцебскім абкомам Кампартыі Беларусі ў 1989 годзе і рэкамендаваны іншым партыйным камітэтам і арганізацыям.

Цікавы вопыт па выхаванню працавітасці, імкнення добрасумленна працаваць назапашаны СШ № 14 Віцебска, дзе партыйная арганізацыя і адміністрацыя змаглі арганізаваць рэнтабельнае гасразліковае школьнае прадпрыемства па вытворчасці нестандартнага фізкультурна-аздараўленчага абсталявання для дзіцячых садоў. Ва ўмовах гаспадарчага разліку працуюць кааператыў «Юнацтва» СШ № 28 Бабруйска, ферма Забродскай СШ Шклоўскага раёна, вучнёўскія вытворчыя брыгады Маліцкай СШ Бярозаўскага раёна, Красненскай СШ Гомельскага раёна»[4].

У ходзе перабудовы агульнаадукацыйнай школы партыйныя камітэты і арганізацыі рэспублікі назапасілі пэўны вопыт работы па ўдасканаленню стылю, форм і метадаў палітычнага кіраўніцтва маральна-выхаваўчым працэсам. Разам з тым X Пленум ЦК Кампартыі Беларусі (1988) падкрэсліў, што школа па-ранейшаму адчувае дэфіцыт партыйнай увагі і клопату. Мерапрыемствы ЦК КПБ і Савета Міністраў рэспублікі па рэалізацыі асноўных напрамкаў школьнай рэформы не змаглі ў поўнай меры забяспечыць пераадоленне негатыўных з'яў у духоўна-маральным станаўленні падрастаючага пакалення. Марудна разбураецца адміністрацыйна-камандная практыка работы з вучнёўскай моладдзю, праяўляецца боязь дэмакратызацыі школы. Важным фактарам інтэнсіфікацыі перабудовачных працэсаў у выхаваўчай рабоце з'яўляецца дынамічнасць жыцця пярвічных партыйных арганізацый. Пленумы абласных камітэтаў Кампартыі Беларусі (май 1988 года) адзначылі, што частка партыйных арганізацый школ рэспублікі заняла пазіцыю чакання, часта ім не хапае глыбіні аналізу выхаваўчых праблем, паслядоўнасці ў іх рашэнні, умення ўзяць на сябе ролю палітычнага кіраўніка. Справаздачныя партыйныя сходы ў школах Мінскай вобласці 1988 года выявілі непадрыхтаванасць многіх настаўнікаў працаваць па-новаму, а атэстацыя кіраўнікоў педагагічных калектываў паказала, што кожны восьмы дырэктар не валодае майстэрствам кіравання калектывам, глухі да наватарства [5]. Ажыццяўляючы перабудову сістэмы маральнага выхавання, партыйныя камітэты і арганізацыі рэспублікі ў шэрагу выпадкаў не змаглі аб'яднаць намаганні больш чым трыццаці арганізацый і ведамстваў, якія адказваюць за выхаванне. У 1988 годзе сярод 4700 непаўналетніх правапарушальнікаў кожны чацвёрты быў школьнікам [6].

Вопыт паказаў, што там, дзе партарганізацыі не праяўляюць прынцыповай патрабавальнасці, дзелавітасці, як правіла, у педагагічных калектывах назіраецца недастатковае разуменне таго, што школа фарміруе духоўны свет і культуру паводзін вучняў. Сур'ёзнага ўдасканалення патрабуе работа пярвічных арганізацый па прыёму педагогаў у члены КПСС. Многія партыйныя арганізацыі школ, асабліва сельскіх, малакалькасныя, гадамі не растуць, значную частку іх складаюць камуністы перадпенсійнага і пенсійнага ўзросту.

Няпростыя задачы маральнага абнаўлення нашага грамадства цесна звязаны з фарміраваннем высокіх грамадзянскіх і маральных якасцей маладога пакалення. Сёння, абапіраючыся на палітычныя рэкамендацыі партыі, настаўніцтва Беларусі прапрацоўвае канцэптуальныя зыходныя пазіцыі для канструявання зместу навучальна-выхаваўчага працэсу як цэласнай сістэмы з улікам яе гарманізацыі, дыялектыкі адзінага і дыферэнцыраванага, інтарэсаў развіцця асобы, дэмакратызацыі школы.

[1] Ленін У. І. Творы. Т. 31. С. 264.
[2] Гл.: Матэрыялы Пленума КЦ КПСС 17—18 февраля 1988 г. М., 1988. С. 57—58; Материалы X Пленума ЦК КПБ 13 мая 1988 г. Минск, 1989. С. 73—74; Гродненская правда. 1988. 18 мая, 30 августа; Настаўніцкая газета. 1988. 27 студзеня.
[3] Гл.: Віцебскі рабочы. 1989. 12 мая, 6 ліпеня, 14 ліпеня, 7 верасня.
[4] Гл.: Віцебскі рабочы. 1988. 21 мая; Магілёўская праўда. 1988. 20 мая; Заря. 1988. 19 мая; Гомельская праўда. 1988. 18 мая.
[5] Гл.: Материалы X Пленума ЦК КПБ. С. 48; Вечерний Минск. 1988. 20 мая.
[6] Гл.: Настаўніцкая газета. 1989. 20 мая.

С. М. ХОДЗІН

# АРГАНІЗАЦЫЯ ПЕРАПРАЦОЎКІ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАЙ ПРАДУКЦЫІ Ў КАЛЕКТЫЎНЫХ ГАСПАДАРКАХ БССР

## (другая палова 20-х гадоў)

Шырокая праграма перабудовы ўсіх сфер грамадскага жыцця, распрацаваная КПСС, прадугледжвае першачарговае вырашэнне харчовага пытання, што немагчыма без паляпшэння перапрацоўкі, захоўвання і рэалізацыі сельскагаспадарчай прадукцыі. У сучасны перыяд побач з развіццём непасрэдна перапрацоўчай прамысловасці вызначаецца таксама стварэнне параўнальна невялікіх вытворчасцей і прадпрыемстваў па перапрацоўцы прадукцыі і дастаўцы яе спажыўцам непасрэдна самімі калгасамі. На Чацвёртым Усесаюзным з'ездзе калгаснікаў падкрэслівалася, што без падсобных вытворчасцей немагчыма і дынамічнае развіццё эканомікі гаспадарак, якое абумоўлена сезоннасцю [1]. Дапаможныя прамысловыя прадпрыемствы ў калгасах — гэта самая простая і найбольш распаўсюджаная форма злучэння сацыялістычнай сельскай гаспадаркі з элементамі прамысловай вытворчасці. Адначасова, гэта адзін з самых старых метадаў вытворчага выкарыстання працоўных рэсурсаў на вёсцы.

А. В. Чаянаў яшчэ ў 1919 годзе ў якасці маласпрыяльнага адрознення арцельнай гаспадаркі ад капіталістычнай, адзначаў, што «апошняя (капіталістычная — С. Х.) утрымлівае ў сабе заўсёды такую колькасць працы, якая неабходна ёй у дадзены момант згодна яе арганізацыйнага плана, і ніводным рабочым больш»[2]. Сапраўды, пераважная большасць сельгасарцелей і камун Беларусі ў час уборкі ўраджаю ў 20-я гады ўжывала наёмную працу. Аднак існаваў і іншы шлях забеспячэння рацыянальнага выкарыстання працоўных рэсурсаў. Па меры аднаўлення сельскай гаспадаркі і далейшага ўмацавання калгасаў станавілася магчымым развіццё на іх тэрыторыі прадпрыемстваў па перапрацоўцы сельскагаспадарчай прадукцыі і іншых вытворчасцей па задавальненню рознабаковых патрэб калектыўных гаспадарак.

На XV з'ездзе ВКП(б) адзначалася, што «гэты працэс стаіць у сувязі з ростам інтэнсіўных культур, жывёлагадоўляй і г. д. і з растучымі экспартнымі магчымасцямі (масларобчыя заводы, сыраварні, кансервавыя заводы, заводы па першаснай апрацоўцы ільну, сушыльні, беконныя заводы і г. д. і да т. п.)»[3].

На працягу першай паловы 20-х гадоў калектыўныя гаспадаркі, узнікшыя на землях дзяржаўнага фонду, маглі карыстацца зямлёй і пабудовамі, якія меліся на ёй, толькі на правах арэнды. Гэта прыводзіла да неэфектыўнага выкарыстання абсталявання і паступовага разбурэння памяшканняў прадпрыемстваў. Пасля XIV з'езда ВКП(б) робяцца пэўныя захады, каб змяніць існуючае становішча. 16 лютага 1926 года прымаецца пастанова Савета Народных Камісараў СССР «Аб парадку перадачы калгасам падсобных і прамысловых прадпрыемстваў»[4]. Згодна пастанове СНК Беларускай ССР (снежань 1926), калектыўным гаспадаркам рэспублікі перадаваліся прадпрыемствы па першаснай апрацоўцы і перапрацоўцы прадуктаў сельскай гаспадаркі (маслабойныя і сыраварныя, пладова-сушыльныя, крухмальныя і інш.), а таксама прызначаныя для абслугоўвання розных патрэб сельскагаспадарчай вытворчасці (лесапільныя, цагельныя і г. д.). Разам з прадпрыемствамі калгасам перадавалася сыравіна, зыходныя матэрыялы і прадукты. Уся азначаная маёмасць запісвалася за калектыўнымі гаспадаркамі ў беспрацэнтную пазыку, якая пагашалася імі на працягу дзесяці гадоў у галіне асноўнага капіталу і трох гадоў — у частцы зваротнага [5].

На пачатку 1926 года была прынята пастанова Эканамічнай Нарады пры Савеце Народных Камісараў БССР аб спецыяльным фондзе для крэдытавання мерапрыемстваў па індустрыялізацыі калгасаў. Пазыкі з гэтага фонду выдаваліся калектыўным гаспадаркам выключна на збудаванне, капітальны рамонт, абсталяванне вытворчых прадпрыемстваў і павінны былі выкарыстоўвацца па непасрэднаму прызначэнню; у адваротным выпадку ўстановам сістэмы сельскагаспадарчага крэдыту дазвалялася патрабаваць іх датэрміновага пагашэння [6].

Выкарыстоўваючы пазыкі з фонду індустрыялізацыі, толькі Магілёўская акруговая секцыя калгасаў вызначыла да аднаўлення ў 1927 годзе 3 крухмальныя заводы, 6 млыноў, маслабойны завод і завод па перапрацоўцы фруктаў. Падкрэслівалася, што «прадпрыемствы павінны павялічыць таварнасць сельскай гаспадаркі, даваць добры прадукт пры невысокім сабекошце і адпавядаць сучасным тэхнічным і эканамічным умовам». На перспектыву (1927—1931 гады) намячаліся высокія тэмпы росту сырзаводаў [7].

З усяго сказанага вышэй, безумоўна, можна зрабіць вельмі важныя высновы на будучае, хоць наш артыкул не ставіць перад сабой задачу кагосьці павучаць. Цяпер савецкі народ ідзе да дэмакратыі. Пераход да яе ажыццяўляецца няпроста. І ён будзе няпростым не толькі таму, што гэтаму аказвае супраціўленне бюракратычная і ўпартая меншасць, якой усё роўна давядзецца пакінуць уладу. Ён будзе складаным па той прычыне, што мы самі значна больш прасякнуты аўтарытарнасцю, чым думаем і мяркуем. Бо здараецца, можна быць аўтарытарным, а выступаць як прыхільнік дэмакратыі і чалавечых правоў, выглядаць такім з боку, пакуль нішто не пагражае тваім уласным інтарэсам. Уздзеянне дзесяцігоддзяў аўтарытарызму можа быць кампенсавана толькі досыць працяглым і моцным уплывам, які дзейнічае ў супрацьлеглым духу. На працягу больш за 70 гадоў, часткова трагічных, не заўсёды шчаслівых, савецкія людзі выбіваліся з сіл спачатку для таго, каб наблізіцца да таго невядомага сацыялізму і камунізму, а потым, каб мець магчымасць дасыта есці. Цяпер, калі самыя неабходныя ўмовы для існавання, дзякуючы перабудове, здавалася б, дасягнуты, з'явіліся сур'ёзныя рознагалоссі. Разумна настроеныя і схільныя прытрымлівацца маральных крытэрыяў і новага, радыкальнага курсу М. С. Гарбачова левыя колы лічаць, што галоўнай нашай мэтай павінна стаць дасягненне роўнасці

і сацыяльнай справядлівасці, пры якіх тыя, у каго цяпер усяго мала, павінны атрымаць больш. Вось такі прыклад: людзі павінны мець права выбіраць на свой густ урача ці школу для сваіх дзяцей, але такое права будзе фікцыяй, калі ўсе грамадзяне СССР не атрымаюць дастаткова магчымасцей карыстацца гэтым, пасылаць дзяцей у школу пры ўмове, што іх выдаткі на гэта будуць адпавядаць даходам. Чалавеку, які займаецца разумовай працай, цяжка свядома і самому адмовіцца ад часткі сваёй свабоды, так неабходнай для далейшай нармальнай работы, свабоды, якую ён усё-такі атрымаў. Аднак цяпер даводзіцца зыходзіць з іншых крытэрыяў выбару. Давядзецца адмовіцца ад долі асабістай свабоды ў імя таго, каб іншыя людзі таксама маглі радавацца вынікамі роўнасці. Неабходны пэўныя ўмовы, каб адмаўленне ад залішняй свабоды дало станоўчыя вынікі.

Кожная ўлада, як вядома, разбэшчвае, а ўлада неабмежаваная і нязменная вядзе да застою. Адны і тыя ж людзі не маюць права ўладарыць бясконца. Радавыя грамадзяне павінны атрымаць права выказвацца па ўсім спрэчным пытанням. Усё гэта добра вядома, з усім гэтым большасць згодна, і ўсе-такі для нас гэта часта нязвыкла.

Шматлікія народы, што жывуць у СССР, могуць існаваць, калі яны здолеюць арганізаваць суверэнітэт ці разумную аўтаномію ў розных рэгіёнах краіны. А гэта, апрача ўсяго іншага, азначае, што народы і асобныя людзі, якія валодаюць вялікімі дабротамі, павінны падзяліцца часткай гэтых даброт з іншымі народамі і грамадзянамі Савецкага Саюза, якія перажываюць пэўныя цяжкасці. Такое пераразмеркаванне матэрыяльных выгод будзе галоўнай гарантыяй захавання грамадскага парадку, а менавіта такі парадак заслугоўвае, каб яго захоўвалі. І толькі калі захаванне такога прынцыпу будзе забяспечана ва ўсіх рэспубліках, краях, абласцях нашай краіны, можна будзе з поўным правам гаварыць аб стварэнні палітычнага грамадства ў СССР.

На наш погляд, мы, савецкія людзі, зможам абыходзіцца без таго, каб нехта з нас вымушаны быў жыць у эміграцыі, а гэта на працягу дзесяцігоддзяў адбывалася пастаянна. Каб мы маглі так жыць, трэба стварыць дэмакратыю на свой лад, прыглядаючыся да вопыту цывілізаванага свету. Задача партыі, як падкрэсліваецца ў праграмнай заяве XXVIII з'езда КПСС «Да гуманнага, дэмакратычнага сацыялізму»,— паслядоўна выступаць за «умацаванне прававой дзяржавы, у якой выключаецца дыктатура якоганебудзь класа, партыі, групоўкі, кіруючай бюракратыі, забяспечваецца доступ усіх грамадзян да ўдзелу ў дзяржаўных і грамадскіх справах, да займання любых пасад; дзяржава і грамадзяне звязаны ўзаемнай адказнасцю пры безумоўным прыярытэце прынятага дэмакратычным шляхам закона і роўнасці ўсіх перад законам»[3].

Рызыка, якую выклікаюць свабода выбару і свабода дзеянняў савецкіх людзей, менш за тую, якая ўзнікне, калі яны будуць дзейнічаць ва ўмовах камандна-адміністрацыйнай сістэмы, ва ўмовах, блізкіх да грамадска-палітычнага выбуху.

Вось некаторыя з пытанняў, над якімі варта задумацца нам, савецкім людзям, што выйшлі з закасцянелай сістэмы ўлады даўжынёю ў многія дзесяткі гадоў[4]. Артыкул гэты напісаны з жаданнем нагадаць, якімі мы нядаўна былі, з тым, каб лепш зразумець, якія задачы нам пад сілу.

[1] Энгельс Ф. Анти-Дюринг. М., 1983. С. 112.

[2] Гл.: Материалы XIX Всесоюзной конференции Коммунистической партии Советского Союза. М., 1988. С. 37.

[3] Правда. 1990. 15 июля.

[4] Гл.: Материалы XIX Всесоюзной Конференции Коммунистической партии Советского Союза. С. 37.

А. М. АЛПЕЕЎ

## РАЗВАЖАННІ АБ НЕКАТОРЫХ ПРАБЛЕМАХ ПЕРАБУДОВЫ Ў ПРАМЫСЛОВАСЦІ БЕЛАРУСІ

Актывізацыя ролі партыі ў эканамічным развіцці патрабуе ажыццяўлення шэрагу радыкальных мерапрыемстваў як у яе арганізацыйнай структуры, так і ў вызначэнні функцый. Акрамя таго, патрэбна старанная распрацоўка праблемы прыярытэту Саветаў у ажыццяўленні канкрэтных вытворча-эканамічных і сацыяльных праграм. І яшчэ адзін важны момант.

У адносінах да эканомікі новае мысленне, аб якім шмат гаворыцца, пакуль яшчэ не прымяняецца. Тут па-ранейшаму пераважаюць падыходы мінулых гадоў. У прыватнасці, шмат сёння гаворыцца аб гаспадарчым разліку, самастойнасці прадпрыемстваў. Але пераход ад слоў да справы здзяйсняецца чарапашнымі крокамі. Прычым сапраўдную гаспадарча-разліковую самастойнасць атрымліваюць толькі стратныя прадпрыемствы, а тыя, у якіх яшчэ тлее жыццёвая сіла, даводзяцца дзяржаўна-бюракратычным механізмам да паміраючага стану. Сіла і дзейснасць існуючага гаспадарчага механізма асабліва выразна праяўляюцца пры аналізе работы прадпрыемстваў, блізкіх Беларускаму металургічнаму заводу (БМЗ, г. Жлобін). Фундамент БМЗ аўстрыйская фірма «Фест-Альпене» разам з падрадчыкамі з Італіі і іншых еўрапейскіх краін заклала ў першай палове 80-х гадоў. Сёння завод працуе, выпускае так патрэбную краіне прадукцыю. І, здавалася б, з тэхналагічнага пункту гледжання праблем быць не павінна. Абсталяванне ж імпартнае і найноўшага ўзору. Ці маем мы на сёння запланаваны эфект? Забягаючы наперад, скажам, што БМЗ не апраўдаў чаканняў ні тых, хто будаваў, ні тых, хто прыйшоў сюды працаваць, ні тых, хто планаваў. І, бадай, на гэтым аб'екце, як у люстэрку, адбіваецца стратнасць механізма ведамаснага, адміністрацыйнага кіравання эканомікай. У гэтым плане цікавым з'яўляецца параўнанне аўстрыйскага і нашага стыляў работы. Тым больш, што аналагічныя заводы мы пачалі ўзводзіць у Рыбніцы (Малдова) і ў Камсамольску-на-Амуры, толькі па ўласнай тэхналогіі і сваімі сіламі. Зладжаная, разлічаная да мінут дакладнасць у рабоце кожнага звяна аўстрыйцаў, пачынаючы ад пастаўшчыкоў і заканчваючы функцыянальнымі абавязкамі кожнага рабочага, дысцыпліна, адсутнасць ведамаснага ўмяшання і кантролю, сапраўды клапатлівыя гаспадарчыя адносіны да ўсяго, нават да зямлі (верхні пласт быў зрэзаны і сёння выкарыстоўваецца для азелянення). Такія ўмовы працы для нашых будаўнікоў — штосьці з галіны фантастыкі. А што ж у нас? Аб'ём будынкаў, напрыклад, у Рыбніцы ўдвая, а ў Камсамольску-на-Амуры — утрая больш, чым у аўстрыйцаў. Зразумела, што ўрадлівай зямлі нашы выкарысталі больш чым у 2 разы — па 110 га. Прычым не здымаючы ўрадлівы слой. Строга па графіку, без аўралаў і штурмаў БМЗ пачаў выплаўляць метал. У Рыбніцы ўсё было інакш, у адпаведнасці з нашым стылем работы. Заключны этап будаўніцтва — гэта масіраваная атака (6 тыс. чалавек) са штабам, які ўзначальвалі другі сакратар ЦК Кампартыі і Старшыня Савета Міністраў рэспублікі. Гэтак жа развіваліся падзеі і ў Камсамольску-на-Амуры. І... абодва нашы заводы яшчэ цэлы год не выдавалі металу.

Забяспечыўшы вытворчасць прадукцыі на БМЗ, аўстрыйская фірма здала завод Мінчармету. З гэтага моманту і пачаліся вядомыя ўсім работнікам нашай вытворчасці «блуканні па пакутах», а завод, які не мае аналагаў, затрэсла і заліхаманіла па ўсіх правілах агульнай хваробы нашага народна-гаспадарчага комплексу. Замест работы напаўсілы ў першы год адладкі абсталявання і праграмнага забеспячэння заводу быў спушчаны дзяржзаказ. І з першага дня імпартная тэхніка пачала эксплуатавацца «на ўсю катушку», без захавання якіх-небудзь тэхналагічных правілаў, без уліку тэрмінаў прафілактычнага рамонту... Работа «з паскарэннем» не толькі не дала выгадаў, але і абярнулася велізарнымі матэрыяльнымі і маральнымі стратамі. У выніку Жлобінскі завод апынуўся на грані спынення. Шмат праблем у БМЗ сёння, але вырашэнне іх па-ранейшаму блакіруецца міжведамаснай раз'яднанасцю, а прасцей кажучы, ведамаснай безгаспадарчасцю. Скажам, пытанне, якое зусім натуральна вынікае з забеспячэння вытворчасці, што нармальна функцыяніруе,— наяўнасць запасных частак. Яго вырашэнне — нязбытная для металургаў мара. Пакуль жа імпартныя дэталі 1300 работнікамі (па штату фірмы іх павінна быць 300) капіруюцца і ў саматужных умовах выпрабляюцца. Праўда, сёння 14 міністэрстваў абавязалі сёе-тое рабіць. Але і гэта «сёе-тое» выбіваецца ў бясконцых паядынках са сталічнымі інстанцыямі, у той час, як з-за адсутнасці нязначнай дэталі прастойвае цэлы агрэгат. Дзе ўжо ў такіх умовах праявіць сваю дзейснасць Закону аб прадпрыемстве, дзе развівацца свабодным кантрактам з сумежнікамі, самастойнаму выхаду на рынак. Дырэкцыя БМЗ не можа нават самастойна ажыццяўляць аплату працы, якая б улічвала спецыфіку прадпрыемства. З улікам усяго комплексу праблем, у тым ліку і сацыяльных, прадукцыйнасць працы на БМЗ усяго ў 1,26 раза большая, чым у Рыбніцы, а меркавалася ў 3 разы большай па галіне.

Хто ж вінаваты ва ўсім гэтым хаосе, неразбярысе, бяздарнай траце інтэлектуальнага і фізічнага патэнцыялу работнікаў? Не будзем капіраваць

розныя варыянты тэхналагічных рашэнняў, якімі ў дастатковай ступені багатыя модныя ў нас рашэнні і пастановы. Корань зла — не ў іх. Ліквідаваць яго магчыма толькі палітычнымі спосабамі. Любыя выстаўляемыя тэхналагічныя рашэнні праблемы ёсць цыраванне дзірак. Перабудова ж мяркуе рэвалюцыйныя пераўтварэнні. І дасягнуць гэтага магчыма толькі вырашыўшы два асноўныя пытанні: аб уладзе і аб уласнасці. Мы ж за гады перабудовы ў іх рэалізацыі прасунуліся вельмі мала. Не стаў пакуль народ гаспадаром краіны. Існуючая ж структура кіраўніцкага механізма паранейшаму дэманструе сваю няздольнасць кардынальна змяніць гаспадарчую сітуацыю. Аб гэтым сведчыць, у прыватнасці, значны аб'ём прамысловай прадукцыі, не прыняты органамі кантролю з першага прад'яўлення з-за наяўнасці дэфектаў, неадпаведнасці патрабаванням стандартаў і тэхнічных умоў. Так, на дапрацоўку толькі ў 1987 годзе было вернута тавараў на суму 1,5 млрд. рублёў. Асабліва кепскае становішча склалася з прадукцыяй машынабудаўнічага комплексу. Толькі 70 % гэтай прадукцыі прымалася з першага прад'яўлення. На Віцебскім і Гомельскім станказаводах імя С. М. Кірава яна склала каля палавіны ўсяго аб'ёму, а ў аб'яднанні «Гомсельмаш» — толькі 20 %. Можна прывесці прыклады прадпрыемстваў, якія выпускаюць якасную прадукцыю і працуюць з поўнай нагрузкай. Гэта ВА «Інтэграл», «Вылічальная тэхніка», Мінскі завод буйнапанельнага домабудавання № 2 і інш. Але ў якія ўмовы пастаўлены гэтыя калектывы кіруючымі цэнтрамі? На заводзе буйнапанельнага домабудавання планы выконваюцца, штогадовы прыбытак, які адлічваецца дзяржаве, складае каля 2 млн. рублёў. Здавалася б, што па здаровай логіцы такога роду калектывы і заахвочвацца павінны больш. Але дзе там! 90 % складаюць у іх адлічэнні ад прыбытку, у той час як у нізкарэнтабельных прадпрыемстваў — толькі 2 %[2]. Такая ж сітуацыя і на ВА «Вылічальная тэхніка» і іншых перадавых прадпрыемствах. Каму гэта выгадна? Адказ адназначны: кіруючаму цэнтру, у дадзеным выпадку — міністэрствам. Вядома, што іх структура ў цяперашнім выглядзе — адна з галоўных складаючых механізма тармажэння. І тут можна поўнасцю згадзіцца з выказанай на з'ездзе народных дэпутатаў СССР думкай аб тым, што трэба ў корані змяніць прынцыпы падыходу да перабудовы кіраўніцкай сістэмы. Ісці не зверху ўніз, а знізу ўверх. На кожным кіраўніцкім узроўні павінны быць толькі такія органы кіравання, з такімі функцыямі і з такой колькасцю апарату, як гэта патрэбна нізам. Існаванне любога органа кіравання апраўдана толькі ў тым выпадку, калі патрэбнасць яго дыктуецца знізу інтарэсамі вытворчасці. Думаецца, калі гэта простае правіла будзе ўлічвацца, то ці наўрад паўторацца памылкі, накшталт будаўніцтва трактарнага завода ў Смаргоні або вызначэнне ўдзельнай вагі прадукцыі прамысловых прадпрыемстваў, што поўнасцю знаходзяцца ў распараджэнні БССР, якая, як абазначана ў плане, павінна вырасці з 7 да 49 %. Што гэта — навукова абгрунтаваныя паказчыкі? Нават павярхоўны погляд на такія планы дазваляе сцвярджаць, што вярстаюцца яны там жа і таксама, як і ў ранейшы час.

Такім чынам, ажыццяўленне першых крокаў перабудовы ў эканоміцы нагадвае бег з бар'ерамі, дзе прафесіянал-спартсмен не ў стане пераадолець прапанаваных яму празмерна вялікіх перашкод. На XIII Пленуме ЦК КПБ (чэрвень, 1989) указвалася, што ў рэспубліцы адзначаецца «захаванне застойных з'яў у эканоміцы і грамадскім ладзе і цярпімасць да гэтага». Не выпадкова, што калі «два гады назад у дэфіцыце было крыху больш як 500 назваў, то цяпер іх ужо больш за 2 тысячы назваў». Спрабуючы прааналізаваць прычыны працяглай стагнацыі, пленум адзначыў, што побач са змяненнем форм і метадаў работы у рэспубліканскай партыйнай арганізацыі, у ЦК КПБ застаецца ранейшай стратэгічная лінія, якая прынцыпова не змяняе становішча. Зыходзячы з усебаковага аналізу абстаноўкі ў рэспубліцы, Пленум ЦК КПБ указаў: «Марудна ажыццяўляецца перабудова кіраўніцтва эканомікай і сацыяльнай сферай з боку Савета Міністраў БССР, міністэрстваў і ведамстваў, выканкомаў саветаў народных дэпутатаў. Не ў поўнай меры дзейнічаюць эканамічныя рычагі гаспадарання, не атрымалі належнага развіцця падрадныя, арэндныя і іншыя прагрэсіўныя формы арганізацыі працы»[3].

Што ж рэкамендуе пленум ажыццявіць з мэтай ліквідацыі тармазоў абнаўлення? У Пастанове чытаем: павысіць патрабавальнасць да кадраў... асаблівую ўвагу ўдзяляць рэалізацыі мер па задавальненню жыццёвых патрэбнасцей людзей... вызначыць канкрэтную праграму дзейнасці па падрыхтоўцы да пераходу з 1990 года на новыя прынцыпы рэспубліканскага самафінансавання і самакіравання... узмацніць уплыў партыі на паскарэн-

не навукова-тэхнічнага прагрэсу... развіваць разнастайныя формы сацыялістычнай уласнасці... дабівацца ўстойлівага забеспячэння насельніцтва прадуктамі харчавання... і г. д.

Уважліва пазнаёміўшыся з рашэннямі пленума, міжволі запытаеш: няўжо гэта 1989 год? Няўжо гэта і ёсць перабудова кіраўніцтва з боку партыі? Думаецца, адказ будзе адназначным. Прыведзеная частка пастановы пленума сфармулявана ў лепшых традыцыях «застойных часоў». Ніводнага канкрэтнага стратэгічнага прынцыпу развіцця, ніводнага канкрэтнага, навукова абгрунтаванага напрамку, нацэленага на сапраўдную перабудову кіравання народнай гаспадаркай. І што ўжо зусім не стасуецца ні з якім цвярозым розумам, цвярозай логікай, што ў сярэдзіне 1989 года (гэта значыць за паўгода) Пленум ЦК КПБ пастанаўляе вызначыць канкрэтную праграму дзеянняў да 1990 года, да пераходу на рэспубліканскі гаспадарчы разлік. У гэты ж час, «што такое гаспадарчы разлік» на сённяшні дзень незразумела большасці гаспадарнікаў, ды і самім партыйным апаратчыкам. Прымаючы пад увагу папярэдні вопыт ажыццяўлення рэформ, небеспадстаўным будзе даць такі прагноз: ізноў будзем прасоўвацца выпрабаваным метадам спроб і памылак, разгойдвацца з боку ў бок. Наўрад ці рухаючыся такім чынам можна разлічваць хоць на нейкія адчувальныя поспехі.

Яшчэ адно, на наш погляд, надзвычай важнае пытанне. Гэта перабудова механізма кіравання эканомікай. Выконваючы рашэнні чэрвеньскага Пленума ЦК КПСС 1987 года, XIX партканферэнцыі, Кампартыя Беларусі пачала распрацоўку новай генеральнай схемы кіравання народнай гаспадаркай рэспублікі. Але да сярэдзіны 1989 года новая схема кіравання як у Саюзе, так і ў БССР не была распрацавана, а навацыі закранулі толькі агульную колькасць кіраўніцкага апарату, што ў выніку не змяніла агульнага механізма кіравання эканомікай, не закранула яго зместу, яго сутнасці. Так, калі ў 1970 годзе ў рэспубліцы ў апараце кіравання было занята 435 тыс. чалавек, то да 1987 года гэтая катэгорыя работнікаў вырасла на 46 %, у той час, як агульная колькасць працуючых павялічылася толькі на 38 % [4]. Інакш кажучы, на кожныя 6—7 працуючых прыпадаў адзін работнік кіраўніцкага апарату. У адпаведнасці з Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР ад 16 чэрвеня 1988 года былі ўнесены змяненні ў сістэму органаў дзяржаўнага кіравання Беларускай ССР. Скасаваны шэраг міністэрстваў і ведамстваў. Кіраўніцкі апарат у рэспубліканскім звяне скарачаецца на 50 %, абласных арганізацый і ўпраўленняў — на 30, а ў цэлым па рэспубліцы — на 26 %. У выніку ў БССР з кіраўніцкага апарату вызваляецца 26 тыс. чалавек [5]. Ці дасягнута жаданая мэта такімі дзеяннямі? Ці стаў апарат працаваць больш эфектыўна? Пакуль, як сведчыць практыка, старыя задачы развіцця эканомікі гэтым актам вырашыць не ўдалося, але затое да іх дабавіліся яшчэ і новыя. Думаецца, што і вызначаны крок не быў прадуманы, навукова не абгрунтаваны аптымальнай структурай апарату, яго зместам і функцыямі. І зноў мы сутыкнуліся з валявым, адміністрацыйным метадам вырашэння праблемы. А ў выніку атрымалі тыя выдаткі, на якія багаты ўвесь гістарычны вопыт развіцця краіны. Механізм тармажэння працягвае дзейнічаць. Відаць, перш за ўсё, у ім і трэба шукаць прычыны невыканання праграм перабудовы.

[1] Гл.: Коммунист Белоруссии. 1989. № 1. С. 51—52.
[2] Там жа. 1989. № 6. С. 49—50.
[3] Советская Белоруссия. 1989. 26, 27 чэрвеня.
[4] Гл.: Смірноў Ю. П., Платонаў Р. П. На крутым пераломе: Нарыс асноўных напрамкаў дзейнасці Кампартыі Беларусі па ажыццяўленню перабудовы. Мінск, 1989. С. 118.
[5] Там жа.

# Рэцэнзіі

И. Н. Олегина. **Критика концепций современной американской и английской буржуазной историографии по проблемам индустриализации СССР.** Л.: ЛГУ. 1989. 222 с.

Монография является продолжением и развитием опубликованной автором в 1971 году работы «Индустриализация СССР в английской и американской историографии». В новой работе автор впервые в советской исторической науке анализирует методологические основы изучения американской и английской историографией промышленного строительства в СССР. И. Н. Олегина выделяет и сопоставляет развитие (с конца 60-х до начала 80-х годов) основных направлений англо-американской историографии — объективистского и реакционного. Подчеркивается преемственность их основных концепций при некоторой модификации, а также активизация всех направлений на рубеже 70—80-х годов, когда максимально обострилось наше противостояние с капитализмом.

Поставленная в монографии цель достигается путем довольно аргументированного разбора взглядов на экономические и социальные проблемы индустриализации как историков-объективистов, пытающихся подходить к их анализу с реалистических позиций и находящих много положительного в советском опыте, так и представителей реакционного направления, концентрирующих внимание на отрицательной стороне опыта. Автор полемизирует с буржуазными учеными по широкому кругу вопросов, особенно тех, которые в последнее время оказались в центре научных дискуссий в нашей стране, а именно: соотношение нэпа и индустриальной политики; обсуждение в 20-х годах проблем индустриализации СССР; роль планового начала в их решении; факторы, обеспечившие успех советской индустриализации, ее социальные проблемы, в том числе рост численности рабочего класса и повышение его социальной активности, изменение социальной инфраструктуры в процессе индустриального строительства, цена индустриализации. По многим проблемам буржуазные ученые высказывают неординарные суждения, дают свою интерпретацию известных и новых фактических данных, выдвигают новые историографические проблемы. Автор отдает им должное и вместе с тем подвергает критике необоснованность и односторонность, непоследовательность и противоречивость оценок индустриализации СССР, особенно ее высокой «социальной цены», которая нашими оппонентами нередко выводится из самой природы советского строя.

В рецензируемой работе нашло отражение своеобразие переломного момента, переживаемого сегодня советской исторической наукой. Так, автор отбрасывает некоторые наши стереотипные утверждения. Например, об упрочении социалистической системы, о реальном социализме, об общем кризисе капитализма. Однако в полемике с буржуазными советологами И. Н. Олегина критически, но, на наш взгляд, недостаточно дифференцированно использует советские исследования конкретно-исторических проблем рассматриваемого процесса. В монографии недостаточно внимания уделено анализу позитивных моментов немарксистской историографии советской индустриализации (использование неизвестных нам документов, освещение «белых пятен» и др.).

В интересах выяснения исторических истин важно развивать прогрессивную тенденцию делового сотрудничества с буржуазными исследователями. Поэтому полезно было бы обратить внимание на слабо изученные или спорные проблемы истории, которые в перспективе могли бы стать полем научного диалога.

В целом объективно-критический анализ американской и английской историографии советской индустриализации проведен И. Н. Олегиной с большой научной ответственностью и на основе исторической правды.

**Е. Ф. Савчук,**
**В. Н. Сидорцов**

**Dějiny pravěku a starověku.** Čast 1—2 / Red. Jan Pečirka. Praha: Státní pedagogické nakladatelství, 1989. 1052 s.

Студенческая аудитория гуманитарных факультетов чехо-словацких вузов получила новую редакцию пособия по первобытной и древней истории, вобравшего в себя достижения исторической науки о древнем мире за последние десятилетия. Материал изложен в нем по принципу синхронности, каждый раздел предваряют список литературы и характеристика источников. Органическим приложением к ним являются иллюстрации, хронологические таблицы и карты. Завершают пособие подробный список литературы и указатели. Есть все основания полагать, что оно написано с учетом требований современной педагогической и исторической науки.

Обратимся к примерам истории Древней Греции и Рима (авторы Я. Печирка и Я. Буриан). В большинстве учебников период ахейской цивилизации рассматривается по традиционной схеме: Критское государство и его падение, Ахейская Греция и нашествие дорийцев. В рецензируемом пособии дан обзор географических и экологических особенностей региона, источников и хронологии, характеристика палеолита и неолита, а также периода бронзы в этом же бассейне, раскрыто содержание минойской и микенской цивилизаций (с. 328—365), что создает целостную картину развития Эллады в древнейший период ее истории. К сожалению, в список литературы не включены имеющие принципиальную важность для науки работы Т. В. Блаватской «Греческое общество второго тысячелетия до новой эры и его культура» (М., 1976) и Г. Ф. Поляковой «Социально-политическая структура Пилосского общества» (М., 1978).

Тщательностью и логичностью изложения материала характеризуется архаический и классический периоды истории Древней Греции. Здесь, как и в последующих главах, изложение соотнесено с разделами известной хрестоматии «Античность в документах» (Прага, 1959—1961. Т. 1—2), что в значительной мере облегчает поиск источников. Особое внимание уделено проблеме древнегреческого полиса, его возникновению, развитию и кризису, древнегреческому рабству. Образование эллинистических государств связывается с восточным походом Александра Македонского, однако их история рассмотрена в присущей чехо-словацкой историографии традиции — в контексте истории древнеримского государства (с. 657—682). Излагаемая концепция сущности эллинизма не противоречит точке зрения советских историков. Представляется, однако, целесообразным включить в соответствующий раздел, кроме Боспорского государства, и другие античные полисы Причерноморья.

Истории раннеримского государства предпослан обстоятельный разговор о финикийской, греческой, этрусской и италийской культурах, внесших определенную коррекцию в его формирование. Не вызывает возражений и стремление показать эволюцию развития римского империализма (в широком понятии этого термина), начало которого Я. Буриан связывает с борьбой Рима и Карфагена за господство в Западном Средиземноморье. История принципата и домината, завершившаяся падением Западной Римской империи, изложена, на наш взгляд, слишком лаконично (с. 760—881), если учесть, что в ее контекст включен раздел о кельтах, германцах, дакоготах, сарматах, славянах и других северных народах. Отсутствует и обстоятельный разговор о раннем христианстве. Однако все это не умаляет достоинств пособия, которое по праву можно назвать одним из лучших по форме и содержанию в современной исторической науке. В этом большая заслуга его авторов и немалая — его редактора, доцента кафедры наук об античной древности Карлова университета в Праге Яна Печирки.

У нас ощущается дефицит в такого рода учебниках и пособиях. Перевод рецензируемого пособия на русский язык с внесением определенных дополнений в списки литературы, а также с добавлением главы об изучении первобытной и древней истории в нашей стране сделал бы его ценным подспорьем для студентов заочной формы обучения.

**К. А. Ревяко,**
**И. А. Лисовый**

В. А. Героименко. **Личностное знание и научное творчество.** Минск: Наука и техника, 1989. 208 с.

Конструирование методологических моделей, адекватно отражающих реальную структуру и динамику науки, всегда выступало одним из важнейших направлений ее философского анализа. Однако если в недалеком прошлом такие модели, ориентированные на классический идеал рациональности, репрезентировали лишь внутреннюю логическую структуру научных теорий и наиболее общие закономерности их развития, то в настоящее время в них пытаются отобразить социокультурный контекст науки, ее историческую эволюцию, многообразные гуманистические закономерности становления и функционирования знания. Исследованию философско-методологического аспекта строения и динамики научного знания, проводимого в контексте целостной субъектно-гуманистической его модели, и посвящена рецензируемая монография.

Данная модель позволила автору достаточно корректно описать полный цикл творческого процесса как динамику основных уровней знания, осуществить синтез концепций личностного знания М. Полани, парадигм Т. Куна, «объективного» знания К. Поппера. Раскрывая односторонность позиций сторонников психологизма и антипсихологизма, В. А. Героименко убедительно показывает, что фактически борьба между ними концентрировалась вокруг вопроса об адекватности психологических и логических моделей мышления реальному мыслительному процессу, была связана с проблемой введе-

ния субъекта в логику и гносеологию при одновременном отображении механизмов формирования объективного знания.

Согласно авторской концепции, субъектно-гуманистическая модель научного знания должна учитывать роль личности как познающего субъекта и в целостном виде воспроизводить структуру и динамику знания в процессе его творческого развития. В этой связи конструируемая В. А. Героименко модель научного знания включает в себя различные виды знания, соотносительные с субъектной организацией познания: личностное (носитель — индивидуальный субъект), парадигмальное (научное сообщество), объективированное (общество), транссубъективное (человечество). В монографии детально анализируются специфические особенности каждого из названных структурных уровней человеческого знания, выявляется рациональная модель внутренней организации знания субъекта-личности, проводится логико-методологический анализ средств его концептуальной репрезентации, конструируется типология неявного и парадигмального знания.

С особым интересом читаются те разделы монографии, в которых раскрываются концептуальные средства описания индивидуально-социального творчества как динамики взаимопереходов личностного и объективированного знания, анализируются средства адекватного объективирования личностного знания. Исследуя процесс приращения личностного знания, процесс вербализации и социализации нового знания, метафорические и модальные средства его выражения в научных текстах, автор показывает, что важнейшее значение предлагаемой им методологической модели заключается в возможности теоретического воспроизведения креативного цикла как единого сложноструктурированного процесса движения человеческого знания. В заключении работы анализируются эвристические возможности применения авторской модели для решения ряда современных научно-практических задач, в частности проблемы представления личностного знания в компьютерных системах.

Вполне понятно, что не все проблемы, затронутые в монографии, раскрыты с одинаковой обстоятельностью. Отдельные выводы автора абстрактны и схематичны. В целом же монография В. А. Героименко заслуживает положительной оценки. Она написана на высоком профессиональном уровне, отличается поисковым, новаторским характером и, несомненно, вызовет живой интерес у всех, кто занимается философско-методологическими и науковедческими проблемами творческой деятельности.

**И. И. Дубинин**

П. В. Кикель. **Математизация научного знания.** Минск: Университетское, 1989. 85 с.

Сегодня математика стала фактором общественного развития. Это проявляется не только в проникновении ее средств и методов практически во все сферы научного познания, но и в сферу техники и технологии материального и даже духовного производства. Поэтому философский анализ феномена математизации науки, техники и практики всегда актуален. Книга П. В. Кикеля не только вводит читателя в круг основных проблем философского анализа процесса математизации. По мнению автора, математизация есть объективно необходимая сторона научного познания и она диктуется объективным единством количественных и качественных характеристик материальных образований и соответственно — необходимостью перехода от познания качественных свойств вещей к познанию количественных характеристик, на стадии которой и выявляются оптимальные условия протекания тех или иных явлений. В связи с этим следует отметить мысль автора о том, что математизация есть условие и момент становления теоретической науки. В то же время и сама теоретизация науки, когда познание углубляется в сущность явлений, выявляет их общие свойства и закономерности, создает необходимые условия для математизации.

Наибольший теоретический интерес представляет глава «Гносеологические аспекты математизации». В ней автором убедительно показано (на примере физики), как математизация способствует развитию понятийного аппарата науки. Это проявляется как в виде обогащения содержания уже существующих, так и через введение качественно новых понятий. При этом большую роль играют такие методы, как введение идеальных объектов, символизация и формализация частнонаучного знания. Следует отметить, что автор подметил важную особенность данного процесса: основные математические понятия становятся частью понятийного аппарата математизируемой теории, имеющей смысл лишь в рамках данной теоретической системы, и обозначают в ней уже не какие-то реальные (единичные) предметы, а некоторые их всеобщие свойства как абстрактные объекты (например, «спин», «заряд», «странность» и т. д.). В этой же главе анализируется еще один важный аспект математизации наук — их интеграция как следствие использования средств и методов математики. В этом плане математизация — это форма объединения научного знания в систему, в основе чего, как верно показано автором, лежит специфика математического познания: оно изучает мир с точки зрения аналогии и подобия, способствуя тем самым синтезу научных представлений. Конкретно это проявляется, например, в применении аксиоматического метода, метода моделирования. Велика роль и специфического языка математики, таких его понятий, как функция, структура и т. д.

Учебно-методическое пособие П. В. Кикеля «Математизация научного знания» выполняет свою основную задачу — ввести будущих учителей в основную проблематику философии математики.

**М. В. Салихов**

## УКАЗАЛЬНІК

**артыкулаў, апублікаваных у «Весніку Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна», серыя 3 (гісторыя, філасофія, навуковы камунізм, эканоміка, права) у 1990 годзе**

### ДА 120-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ У. І. ЛЕНІНА


*Дронь П. П.* В. И. Ленин и актуальные проблемы нравственного воспитания . . . 1 6
*Кабяк С. У.* У. І. Ленін і рэвалюцыйны рух у Заходняй Беларусі . . . 1 9
*Шаврук И. В.* Ленинская концепция социализма . . . 1 3


### ГІСТОРЫЯ


*Бондар П. І.* Партыйнае кіраўніцтва маральным выхаваннем працоўных: урокі 60—80-х гадоў . . . 2 3
*Гарбуль П. І.* Прапаганда друкам рэспублікі навукова-тэхнічнага прагрэсу ў прамысловасці (1983—1989) . . . 2 12
*Герасімовіч Э. Я.* Партыйны ўплыў на развіццё і ўмацаванне прафсаюзных арганізацый у калгасах і саўгасах Беларускай ССР (1976—1985) . . . 1 17
*Ильящук Г. И.* К вопросу о существовании так называемого «Союзного Бюро социал-демократов-меньшевиков» . . . 3 15
*Калеснікава Т. К., Мельнік Ф. І.* Творчая актыўнасць рабочых прамысловасці Беларусі ў 70—80-я гады: вопыт, праблемы . . . 3 3
*Коршук У. К.* Подзвіг народа (Да 45-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне) . . . 1 13
*Ксянзоў С. У.* Інтэрнацыянальныя сувязі Беларускай ССР і еўрапейскіх сацыялістычных краін: этапы развіцця . . . 1 20
*Лапо І. М.* Перабудова сістэмы маральнага выхавання ў школах Беларусі на сучасным этапе (з вопыту работы КПБ) . . . 3 9
*Левшевич А. А.* Адрианопольский мир и экономическое развитие Дунайских княжеств . . . 1 25
*Мороз Ю. М.* Англо-русские отношения 1907—1914 годов в оценке буржуазно-либеральной журналистики России . . . 2 15
*Раманоўскі І. Ф., Шадурскі В. Г.* Партыйнае кіраўніцтва рухам настаўніцтва: становішча і праблемы (1976—1987) . . . 3 6
*Растаргуеў А. У.* Аб праблемах падрыхтоўкі кадраў рабочага класа ў сярэдняй школе Беларускай ССР (1959—1966) . . . 2 6
*Ревяко К. А.* Современная историография ФРГ о пунических войнах . . . 1 23
*Станішэўская Л. П.* Супрацоўніцтва БССР і НРБ у галіне трактарабудавання . . . 2 17
*Филиппенко С. И.* Германия и проблема реорганизации Совета Лиги наций 3 18
*Ходзін С. М.* Арганізацыя перапрацоўкі сельскагаспадарчай прадукцыі ў калектыўных гаспадарках БССР (другая палова 20-х гадоў) . . . 3 12
*Эсмантовіч І. І.* Удзел камсамольскіх арганізацый вышэйшых навучальных устаноў Беларусі ў павышэнні вучэбнай актыўнасці студэнтаў (1961—1970) . . . 2 9


### ФІЛАСОФІЯ


*Бонько В. К., Миськевич В. И.* Познавательная потребность: социально-исторический аспект . . . 1 29
*Гарбаценкава Л. М.* Маральнае выхаванне студэнтаў: сацыялагічныя даследаванні, праблемы і пошук рашэнняў (па матэрыялах навукова-практычнай канферэнцыі) . . . 2 34
*Грушка Михал.* Теоретические основания современного католического учения о свободе совести . . . 3 35
*Кириченко Е. Г.* Гипотеза в структуре социального познания . . . 2 24
*Ковалевич В. И., Петрушова Е. И.* О методах укрепления дисциплины труда 1 41
*Кубишова-Грушкова Мирослава.* К вопросу о статусе понятия «человеческий фактор» . . . 1 36
*Кузнецов А. В., Максимова Н. А.* Уроки Великой французской революции и современность . . . 2 31
*Листопадская И. В.* Место категории «труд» в системе марксистского гуманизма . . . 1 38
*Михайлов А. А.* Завершающий аккорд критической системы И. Канта (к 200-летию выхода в свет работы «Критика способности суждения») . . . 3 21
*Морозов И. М.* Понятие «бессознательное» в работах К. Маркса . . . 2 21
*Поликарпов В. А.* Социокультурные общности молодежи в условиях перестройки . . . 3 38

*Потерухина Л. П.* Общение как фактор развития личности . . . . 3 32
*Рожин Н. В.* Проблема референции и объективность знания . . . . 3 27
*Силин Н. А.* Логико-методологические аспекты перестройки стиля научного мышления в современной медицине . . . . . . . . . . . . 2 28
*Яскевич Я. С.* Эвристический потенциал процедуры обоснования научного знания . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 1 32
*Огородник В. П.* Роль художественной интеллигенции в развитии межнационального общения . . . . . . . . . . . . . . 3 40

## НАВУКОВЫ КАМУНІЗМ

*Белякович Н. Н.* Социальное развитие рабочего класса в условиях обновления социализма . . . . . . . . . . . . . . . . . . 2 41
*Гайдученок И. А.* Творческие аспекты образования в трактовке Д. Г. Лоуренса . . . . . . . . . . . . . . . . . . 2 44
*Допкюнас А. В.* Процессы политической социализации в современной Великобритании . . . . . . . . . . . . . . . . . . 1 49
*Симановский С. И.* Требования к личности молодого рабочего в условиях перестройки . . . . . . . . . . . . . . . . . . 1 46
*Шалькевич В. Ф.* Сен-Симон и его место в истории социалистической мысли . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 2 38

## ЭКАНОМІКА

*Бачко І. Ю.* Сацыяльна-эканамічная форма асабістага фактара сацыялістычнай вытворчасці . . . . . . . . . . . . . . . . 2 56
*Береснева А. И.* Аграрные отношения: проблема использования многообразия экономических форм . . . . . . . . . . . . . 1 53
*Бесман В. В.* Рынок как экономическая категория . . . . . . 3 52
*Ермакова К. В.* Сацыяльна-эканамічныя праблемы працы жанчын у грамадскай вытворчасці . . . . . . . . . . . . . . . . 2 51
*Ермалович Л. П., Фирисанова М. Л.* Экономика здравоохранения: проблемы и пути решения . . . . . . . . . . . . . . . . 1 59
*Ермалович Л. П., Быкова Т. П.* Особенности проведенного К. Марксом научного анализа заработной платы и его методологическое значение . . . . 3 44
*Китаёва Л. И.* Условия производства и особенности развития процесса обобществления сельскохозяйственного производства . . . . . . . . 1 56
*Напрейкова В. И.* Развитие кооперации и укрепление дисциплины труда 2 53
*Научитель М. В.* Об экономической теории предложения . . . . . 3 47
*Цеханович Е. Е.* Методологические основы формирования работника нового типа в системе образования . . . . . . . . . . . . . 2 48

## ПРАВА

*Бибило В. Н.* Регулятивные возможности уголовно-процессуальных норм 1 63
*Бібіла В. М.* Спрэчныя пытанні правядзення экспертызы ў крымінальным працэсе . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 2 64
*Власова Л. В., Колосовский А. Н.* Юрисдикционный иммунитет государств в отношении их собственности . . . . . . . . . . . . . . . 3 62
*Голованов В. Г.* Актуальные проблемы предупреждения правонарушений 1 69
*Григоренко В. Н.* Из истории прокуратуры Белоруссии . . . . . 2 70
*Зенькович В. А.* К вопросу о совершенствовании законодательства по предотвращению обмана покупателей . . . . . . . . . . . . . 3 59
*Мартинович И. И.* Национальные камеры народного суда в истории судоустройства Белорусской ССР . . . . . . . . . . . . . . 2 67
*Мошканов А. С.* Предмет доказывания по делам об ограничении дееспособности граждан . . . . . . . . . . . . . . . . . . 3 65
*Павлова Л. В.* Некоторые аспекты практики международного арбитража 2 60
*Сатолин В. Н.* Законодательство о браке и семье, действовавшее на территории Белоруссии в первые годы Советской власти . . . . . . . . 3 56
*Уржинский К. К.* Правовые нормы об определении трудовой функции рабочих и служащих в системе права . . . . . . . . . . . . 1 66

## ДЫСКУСІЙНАЯ ТРЫБУНА

*Алпееў А. М.* Развażанні аб некаторых праблемах перабудовы ў прамысловасці Беларусі . . . . . . . . . . . . . . . . . 3 71
*Клімовіч В. С.* Чаму нам патрэбна дэмакратыя . . . . . . . 3 69

## НА КАФЕДРАХ І ФАКУЛЬТЭТАХ

*Сатолин В. Н., Чудаев М. Ф.* Подготовительное отделение БГУ в системе довузовского обучения молодежи . . . . . . . . . . . . . 1 73

## РЭЦЭНЗІІ


*Базылев Н. И., Середа В. С.* История политической экономии капитализма 2 78
*Вязовкин В. С., Кузнецова Л. Ф.* Владимир Цонев. Картината на света и нейната светогледна и методологична роля . . . . . . . . . . 2 75
*Героименко В. А., Барковская А. В.* М. А. Слемнев. Лабиринты познания; Я. С. Яскевич. В поисках идеала строгого мышления . . . . . . . . 1 77
*Дубинин И. И.* В. А. Героименко. Личностное знание и научное творчество . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 3 76
*Казакоў Ю. Л., Рамаиоўскі І. Ф.* І. Е. Марчанка, У. І. Навіцкі. Беларуская ССР: курсам перабудовы . . . . . . . . . . . . . . . . 2 74
*Корщук В. К.* Р. Х. Муртазаева. Экономика — основа интернационального единства . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 2 78
*Левченко Л. А., Прошин А. И.* Коренная перестройка экономики . . . 1 78
*Пилипенко М. Ф.* Л. И. Тегако, И. И. Саливон. Основы современной антропологии . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 2 77
*Ревяко К. А., Федосик В. А.* Ю. Е. Ивонин. Становление европейской системы государств: Англия и Габсбурги на рубеже двух эпох . . . . . 2 76
*Ревяко К. А., Лисовый И. А.* Dějiny pravěku a starověku . . . . . 3 76
*Савчук Е. Ф., Сидорцов В. Н.* И. Н. Олегина. Критика концепций современной американской и английской буржуазной историографии по проблемам индустриализации СССР . . . . . . . . . . . . . . . 3 75
*Салихов М. В.* П. В. Кикель. Математизация научного знания . . . 3 77
*Сушкевич Л. П., Федосик В. А.* З історії стародавності і середньовіччя: Збірнік наукових праць . . . . . . . . . . . . . . . 1 76
*Царук Н. А.* В едином строю борцов за мир: Общественность Белорусской ССР в движении сторонников мира . . . . . . . . . . . . 2 75